АСЕННІЯ ПРОМНІ

ДЗМІТРЫ ШАТЫЛОВІЧ

АСЕННІЯ ПРОМНІ

Беласток 2006

УСПАМІНЫ З ПАДЛЯШША

ЦАРСКІ ПАЛАЦ У БЕЛАВЕЖЫ

Часта бачу ва ўспамінах вобраз свежы,
Прад вачыма ён стае мне, як скала,
Як прыпомню, як калісьці ў Белавежы
Я пабачыў царскі казачны палац.
Я паехаў разам з вучнямі са школы,
Паказалі нам зброў і цэлы парк,
Дуб Ягайлы мы абходзілі наўкола,
Расказалі нам, што паляваў тут цар.
Нам пасля яго палац тут паказалі
Можа з сотняю бліскаючых акон,
Чарапіцы даху ззялі, як каралі,
Ажыўлялі неба бледнаваты фон.
У палацы мы хадзілі па пакоях,
Любаваліся ўнутры яго красой,
Дзверы з люстрамі блыталі мы парою,
Як хацелі перайсці ў другі пакой.
Люстры ў сценах нам здаваліся дзвярыма,
А паркеты на падлозе, як дыван,
І небачаная мэбля прад вачыма
Нас уводзіла ў чароўны дзіўны зман.
А на сценах каляровыя карціны
Кандэлябры і падсвечнікі наўкол,
І гірлянды з кветак розных і гардзіны,
Акружалі нас усіх, як арэол.
А на столях люстры - пацеркі з крышталю
Ззялі, як бурштыны ў жоўтым бляску лямп,
Часам, як брыльянты яркія звісалі,
Асвятлялі твары на партрэтах дам.

Некалькі пакояў поўныя трафеяў
З паляванняў розных на жывых звяроў,
Там віселі рогі лосяў і аленяў,
І галовы мёртвых пушчанскіх зброў.
Першы раз я з вёскі быў тут у палацы,
Унутры глянуў я, як жылі цары,
Пахадзіў я звонку па шырокім пляцы,
Бачыў пушчу, як хадзілі ў ёй звяры.

КЛЯШЧЭЛІ Ў МІНУЛЫМ

З дзяцінства я помню дарогу ў Кляшчэлі,
Якою хадзіў я з Чаромхі сяла:
Спачатку праз поле, дзе летам жаўцелі
Зярняткі калоссяў у промнях святла.
А потым праз луг Паламою названы,
Дзе бачыў на пашы я многа кароў,
Далей зноў на полі рос лубін духмяны,
І цёмна-чырвоная грэчка, як кроў.
За ёй луг зарослы зялёнай лазінай,
Тут польскі з'явіўся ў вайну самалёт,
Схавалі яго мы пад сотняй галінак,
Каб з неба не ўбачыў нямецкі пілот.
Тут лётчыкі суткі чакалі бензіну,
Да іх даляцеў на другі дзень біплан,
Пасля прывітання, кароткай гасціны,
Забрала іх неба ў пусты акіян.
За лугам цягнулася жоўтае поле,
Заўжды там рос толькі авёс і ячмень,
Без дрэў і кустоў тут было наваколле,
Нішто не кідала на землю свой цень.
Ды ў моры пяску над палямі тырчэлі,
З цэменту стаўбы, агароджы пруты,
А дрэвы высокія ў небе цямнелі,
Як быццам там рос ліставы лес густы.
А гэта быў толькі яўрэйскі магільнік,
Стаялі там помнікі, ды без крыжоў,
Пры сетцы кустамі палын рос і быльнік,
За сеткаю макі ірдзелі, як кроў.
За гэтым пагостам на горцы пясчанай
Зноў крыллем махалі ўдзень два ветракі,
Малолі ў іх збожжа з сёл блізкіх сялянам
Жыды два з бародамі, як блізнюкі.

Унізе за горкай пры самай дарозе
Гудзеў цэлы дзень лесапільны завод,
Стаялі ў чарзе там пры кожнай пагодзе
Фурманкі з драўнінай амаль цэлы год.
Далей быў праезд, бо была там чыгунка,
І рэек дзве пары блішчэлі здалёк,
Падчас цягнікі ішлі ў розных кірунках:
Адзін бег у Брэст, а другі ў Беласток.
Далей я ішоў брукаванай дарогай,
Між густа заросłых травою лугоў,
Яны падыходзілі аж да парогаў
Дамоў гарадскіх ці сялянскіх хлявоў.
Налева быў Костка, фатограф знаёмы,
Рабіў ён мне здымак за тры пятакі.
Драўляныя хаты пад гонтай, саломай
Стаялі радамі да самай ракі.
А ўнізе пры рэчцы гудзеў, як шалёны,
Таксама габрэйскі маторны ўжо млын,
Муку, што змалоў ён, вязлі і ў вагоны
Грузілі на станцыі, як нафталін.
Пры белай царкве ля галоўнай дарогі,
Жыдоўскія крамы абселі ўвесь пляц,
Купец запрашаў у ларок свой убогі
Тут кожнага госця, як дзесь у палац.
Пры пляцы каваль- жыд каваў людзям колы,
Падкоўваў ён коней, рабіў малаткі,
Яўрэй жа кравец, вёў кравецкую школу,
І гояў вучыў там, як шыць пінжакі.
Што тыдзень на пляцы заўжды ў панядзелак
Стаялі дзесяткі сялянскіх вазоў
Са збожам, з жывёлай. Гудзеў пляц ад здзелак,
Ад гучнай рэкламы мажных крыкуноў.
Стаялі сталы з разнародным таварам,
Наіўных абманвалі ў карты гульцы,
Стараліся жулікі ўзяць нешта дарам
І з крадзенай рэччу ў натоўп уцячы.

У свята, ў нядзелю прыходзіў я часта
Маліцца ў царкву разам з маткай маёй,
Глядзеў, як святар Уладзімір Кудраўцаў
Лячыў звар'яцелага мовай сваёй.
Гавеў я пасля ў Мікалая Рудэчка,
Шапнуў мне на вуха: „Чырвоным не вер,
Бяды нарабілі ўжо ў нашым мястэчку,
Варожасць прыносячы і недавер".
Змянілася многа ад гэтага часу,
Загінула большасць мясцовых жыдоў,
Якія былі заўважальнай акрасай
Маленькіх мястэчак пражытых гадоў.
Вайна з акупацыяй знішчыла горад,
Амаль на паўвека ён вёскаю стаў,
І вось адмяніўся, як ў рошчыне солад,
Правы гарадскія ён зноў атрымаў.

У ДЗЯЦІНСТВЕ

Нас калісь і вясною і летам,
Аж прыходзіў асенні мароз,
На вясковых лугах і палетках
Спатыкалі ўвесь час басанож.
Мы на пожні калечыпі ногі
І кроў часта сплывала нам з ран,
Басанож мы аралі аблогі
І свае, і суседніх сялян.
Басанож мы хадзілі па лесе,
Басанож мы ішлі ўдалячынь,
Мы не слухалі ў радыё песень,
Мы іх чулі ад нашых дзяўчын.
Мы пры газавай лямпе чыталі,
Электрычнай не зналі зусім,
І мы з ягад рабілі каралі,
Каб аддаць іх дзяўчатам сваім.
Без сядла мы на конях галопам
Дзесь на пашу скакалі вярхом,
Не адзін з нас бываў землякопам,
А часцей усяго пастухом.
Мы з гляістай вады вынасілі
На плячах вязкі сена на луг,
Па калені ў балоце паўмілі,
Не адзін мы рабілі там круг.
Мы ўсе летам сярпом жалі жыта,
Ці за жняяй вязалі снапы,
Не наеліся часта дасыта,
Ноччу многіх кусалі клапы.
Мы аднак увесь час роднай мовай
Карысталіся ўсе між сабой,
Шанавалі мы родныя словы,
Не цанілі мы мовы чужой.

Роднай моваю на перапынках
Карысталіся, як у сям'і,
За абразу яе ў паядынках
Жартаўнік пацярпеў, як у баі.
Мы валодалі мовай дзяржаўнай,
Нас у школе вучылі яе,
А малітвы царквы праваслаўнай
Мы ўсе зналі, як пальцы свае.
Іх вучыліся мы ад калыскі,
Пасля ў школе вучуў нас святар,
А царкоўны абрад візантыйскі
Ззяў для нас, як чароўны ліхтар.
Хоць цярпеў я тады невыгоды
І ў жару, і ў часы халадоў,
Хоць меў мала тады асалоды,
Мне шкада, тых мінулых гадоў.

ЛЁС МАЁЙ МАТКІ

Лёс маткі маёй быў не вельмі ласкавы,
Як многіх калісь на Падляшшы жанчын,
Яна пражыла тры вайны, тры дзяржавы,
Прабегла ў час бежанства многа сцяжын.
Блукала адна па расійскіх прытонах
Пазнала там холад і голад, і страх,
Вярталася ў вёску ў таварных вагонах,
Цягнуўся паўгодзе чыгуначны шлях.
У вёсцы застала маленькую хатку
Зарослую вокал травой, крапівой,
Валялася ўсё на двары ў беспарадку,
Гудзеў у хляве пад страхой восаў рой.
І стала там жыць адзінокая ў хаце
Пакуль не вярнуўся мой бацька здалёк,
Тады я з'явіўся на гэта багацце,
Як летам на кветку малы матылёк.
Ды хутка для бацькі ўсміхнулася шчасце,
Атрымаў ён пенсію, грошы з казны,
Тады ён фундамент пад дом мог закласці,
І сталі ў ім жыць мы праз дзве-тры вясны.
Там матка мая гаспадарыла ў доме,
Каровы даіла, карміла свіней,
І мыла бялізну ў малым вадаёме,
Паіла, карміла курэй і гусей.
У агародзе садзіла фасолю,
Капусту, і боб, агуркі, кавуны,
І бульбу ўкідала ў барозны на полі,
Палола не раз на палетках ільны.
Пасля гэты лён вырывала з зямліцы,
З яго выбівала ўсё зерне брусом,
Сушыла яго, ачышчала з кастрыцы,
Часала яго цэлы дзень напралом.

А летам сярпом жала спелае збожжа,
Збірала яго і вязала ў снапы,
Складала ўсе ў бабкі іх вельмі прыгожа,
І значыла іх, як дайшла да капы.
З вады вынасіла ў вялікай спякоце
Вільготнае сена дзесь на мелізну.
Зімою на прасніцы на калаўроце
Зноў прала на ніткі з кудзелі ільну.
І з кужалю шэрага ткала палотны,
Якія на сонцы бяліла святлом,
З іх шыла для ўсіх нас сарочкі ахвотна,
Сваймі ручнікамі ўпрыгожвала дом.
Хадзіла ў нядзелю пяшком у Кляшчэлі,
Каб там памаліцца за нас у царкве.
Сама хлеб пякла і рабіла тэфтэлі,
І зёлкі збірала вясной на траве.
І ў час нежаданых ваенных падзеяў,
Якія прыйшлі, як вясной градабой,
Яе муж загінуў ад кулі зладзеяў,
І стала яна нечакана ўдавой.
Асталася ўраз з малалетняй дачкою,
Без мужа, сячкарні, гумна і каня,
Бо вёска згарэла ў час дзікага бою,
Яе дом аднак ацалеў ад агню.
Я быў у той час у нямецкай няволі,
Не знала яна, ці вярнуся жывы,
Збірала з дачкой ураджаі на полі,
Пры доме паставіла зноў два хлявы.
Калі да яе я прыехаў шчаслівы
З вайсковаю сумкаю ноччу, зімой,
У школу паслала мяне спагадпіва,
Хоць цяжка было ёй тады жыць з дачкой.
Закончыў ліцэй я з яе дапамогай,
Паслалі вучыцца мяне ў Ленінград,
З'явіўся зяць хутка з падмогаю Бога
У доме яе, як дзесь знойдзены клад.

Ёй стала лягчэй пры дачцэ і пры зяцю,
Хоць працы пры доме хапала ўвесь час,
Насіла ў хлявы корм свінні і цяляці...
Хацелі яе зацягнуць у калгас.
Пасля зноў унучак яна калыхла,
Чатыры іх мела на рукі свае,
У полі таксама не раз працавала,
І ежу варыла, як гонар яе.
Калі ж я ў Варшаву вярнуўся з вучобы,
Не раз прыязджала яна да мяне.
На шлюбе маім у царкве, як аздоба,
Стаяла пры тых, што трымалі вянец.
Не раз у мяне пражыла і паўгодзе,
Выходзіла часта на шпацыр з дзяцьмі,
Вярталася зноў, каб пабыць на свабодзе
У вёсцы сваёй ля даччынай сям'і.
Да шлюбу сваёй найстаэйшай унучкі
Раптоўная смерць не дала ёй дажыць...
Бясконца лёс маткі маёй самавучкі
Заўжды ва ўспамінах маіх будзе жыць.

СУЧАСНАЯ СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗЬ

Непадобнаю стала сялянская моладь,
Да той моладзі з даўніх гадоў,
Бо і вучыцца ў лепшых умовах і школах,
Як вучылі калісь іх дзядоў.
Не сядзіць больш у вёсках пры газавых лямпах,
Электрычнае мае святло,
І не чула варожых гармат грозных залпаў,
Як снарады гудзяць над сялом.
Тэлевізары мае амаль кожны ў хаце,
І транзістар іграе ўвесь дзень,
Праглядае на фільмах чужое багацце
І ў палацах красу і духмень.
І зайздросціць, што людзі жывуць так багата
У раскошы, без працы, турбот,
І сумуе, што рэдка ў жыцці мае свята,
І што многа навокал маркот.
Падзялілася моладзь на бедных, багатых,
Бо адны ў школу ходзяць пяшком,
А другіх зноў прывозіць шафёр аж з- пад хаты
На машыне бліскучай, як хром.
І адны з іх прыходзяць без снедання ў школу,
Іх бацькі з дапамогі жывуць,
А другія кідаюць грашамі наўкола,
І на бедных глядзяць, як на муць.
Аднаго тут зайздрошчу цяпер нашай моладзі,
Што ніколі не знала вайны,
Што ў атаку не бегла па снезе, на холадзе,
Не згінала ў акопах спіны.
Што не знала ў няволі варожых прытонаў
На чужой і далёкай зямлі,
І не бачыла страшных ваенных палонаў,
Дзе салдат, як сабак, сцераглі.

Не зайздрошчу я модных іх вопратак новых,
Ні мабільнікаў вельмі малых,
Ні праграм з тэлевізараў іх каляровых
Прымітыўных і нудных, і злых.
У праграмы ўціскаюцца часта рэкламы,
І спыняюць іх фабулу, змест,
Або бачым у фільмах адны меладрамы,
Або толькі злачынства і секс.
Я са смуткам гляджу, як сучасная моладзь
Бестурботна спачатку расце,
Потым мучыць яе беспрацоўе і голад,
Доўга працы не можа знайсці.
І шукае яе на чужыне далёкай,
Між падступных варожых людзей,
Як нявольнік працуе зімою і ў спёку
Самахоць без жыццёвых надзей.
Многіх ўцягваюць там у злачынныя шайкі
У наркотык, крадзеж і ў разбой,
Горш там мучаць яе, чым калісь нас нагайгі,
Ці варожы нямецкі канвой.
Хоць пасля злых гадоў небяспечнай пакуты
Мы не мелі дастатку ў жыцці,
Ды не мучыла нас беспрацоўя атрута,
Кожны працу мог лёгка знайсці.
Хто вучыцца хацеў, меў адкрытыя дзверы
Ва ўсе школы ва ўсіх гарадах,
І сялянская моладзь рабіла кар'еры,
Ды цягнула другіх па слядах.
.

МЕСЯЦ КРУГЛАТВАРЫ

З цёмнай чашы неба месяц круглатвары
Спаглядае зверху цэраз акуляры
На будынкаў дахі і на тратуары,
І на гарадскія цёмныя бульвары.
Падміргнуў яму я са свайго балкону,
Ён тады насунуў на сябе карону.
З залацістай хмары з зоркаю чырвонай,
На мяне ўзглянуўшы вельмі падазрона.
Ён мяне спытаўся: што хачу я ведаць?
Праз акно ён бачыць у майго суседа,
Шумная праходзіць нейкая бяседа,
Як мне вельмі смутна, іх магу наведаць.
Не, хачу, каб глянуў ён з нябеснай чашы,
Што тварыцца сёння на маім Падляшшы:
Ці пасуцца коні, як калісь, на пашы?
Ці сяляне ходзяць боса, ці ў камашах?
Ён сказаў мне смутна: там ужо крамола,
Многа хат пустуе, брак дзяцей у школах,
Школы ўжо закрылі ў вельмі многіх сёлах,
І галеча ў вёсках бачыцца наўкола.
Уцякаюць з вёсак хлопцы і дяўчыны,
Едуць дзесь да працы ў іншыя краіны,
І там забываюць продкаў і айчыну.
А жывуць у вёсках старыя жанчыны.
Зараслі травой там рэйкі ад чыгунак,
Труціць старыканаў алкагольны трунак,
А яго з усходу шлюць, як пачастунак...
І ніхто не знае, дзе для іх ратунак.

У РОДНАЙ ВЁСЦЫ

Амаль нічога тут няма
З майго дзяцінства ў роднай вёсцы,
Цяпер і востpая зіма
Сюды прыходзіць рэдка ў госці.
Няма дамоў тых, на якіх
Чытаў я прозвішча знаёмых,
Ды іх цяпер няма ў жывых,
Я бачу толькі невядомых.
Няма высокіх журавоў,
Што падавалі людзям воду,
Цяпер вада, як жылай кроў,
Плыве да хат трубаправодам.
Няма ўжо бруку між дамоў,
Які цягнуўся цэраз вёску,
Няма на ім малых вазоў,
Ад іх навокал чуўся лёскат.
Там дзе быў брук, ляжыць асфальт,
Як палавік чарнее з гумы,
Як бы ракой тут плыў базальт
З пахам далёкім ад парфумы.
Няма старых маіх слядоў,
Равы прапалі, каляіны,
Астаўся толькі бацькаў дом,
Такім амаль, як я пакінуў.
Аднак на ім громаадвод
Ля коміна стырчыць на даху.
Ён без яго дзесяткі год
Пражыў без боязі і страху.

У ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

Як ліхтар ноччу цёмнай, зяззяла надзея
Для мяне ў дзевятнаццаты год,
Што чакаюць мяне ўжо другія падзеі
Без бадзянняў, без страшных нягод.
    Што нарэшце вярнуся я ў родную хату,
    Дзе дзяцінства сваё я правёў,
    І што скіну з сябе я чужыя халаты,
    І вучыцца пайду ў школу зноў.
І дазволілі мне развітацца з Бабруйскам,
Ды шчасліва вярнуцца дамоў,
Стаў нарэшце ў гімназіі я беларускай,
Зноў вучыцца між добрых сяброў.
    Дзевятнаццаты год мой быў вельмі шчаслівы,
    Бо змяніў мой жыццёвы ўвесь лёс,
    Даў мне вольную волю сярод роднай нівы,
    Даў мне сілу на новы мой крос.
Даў магчымасць мне вырвацца з дзікай няволі,
І дарогу ў жыццё паказаў,
З той пары, як маяк, ён святлом моцнай волі
Мне кірунак між бур асвятляў.
    Каб тады ён затрымаў мяне на чужыне,
    Не дазволіў мне зняць кайданоў,
    То жыццё бы пабегла па іншай сцяжыне,
    Дзесь між скал, над глухой цаліной.
Быў я ўдзячны яму праз гады ўсе другія,
Я яго ўспамінаў, як найлепшы мой год,
І ўстаюць прада мной дні яго, як жывыя,
Помню кожны я ў іх эпізод.

БАЦЬКОЎСКАЯ СЯДЗІБА

Стаіць адзінока сядзіба бацкоўекая,
Як з'явіцца восень, а потым зіма,
Пільнуе яе там радня чарамхоўская,
Ды ў хаце тады ўжо нікога няма.
Сястра выязджае ў кватэру з выгодамі,
Дзе мае заўсёды ў ёй душ і цяпло,
Сядзіба пустуе з гумном, з агародамі,
Ніхто не запаліць у хаце святла.
Хлявы ўсе пустыя стаяць без жывёліны,
Зімой не спявае ніколі пятух,
Стаіць там гумно без зярнятак фасоліны,
І бегае вецер на вышках, як дух.
Калі тут запахне вясною чароўнаю,
Зялёнаю стане навокал трава,
Сястра прыязджае з ахвотай агромнаю,
Наводзіць парадак у хаце, ў хлявах.
Разводзіць тут куры і гусі крыклівыя,
І ветрыць пакоі і кухню штодзень,
Праходзяць ёй хутка ўсе дні мітуслівыя,
І ноччу не страшыць яе тут глухмень.
Тут кветкі засадзіць за хатай духмяныя,
А нават і моркву, граду агуркоў,
Адна тут жыве ў цішыні, паважаная,
Вясною і летам праз многа гадоў.
Наведвае часта дачку найстарэйшую,
Якая ў пасёлку Чаромха жыве,
А дочкі другія знайшлі долю лепшую,
У цэнтры ў Чыкага жывуць нават дзве.
Дамы два там мае дачка наймалодшая,
І іх кватарантам наймае ўвесь час,
І з мужам жыве там, як пані заможная,
І матку прывозіць у дом свой падчас.

Сястра восень, зіму гуляе ў Амерыцы,
Наведвае ўнука, другую дачку,
А тут у сядзібе бацькоўскай мяцеліцы
Танцуюць і свішчуць у кожным кутку.
Зімою сядзібы стаяць адзнокія,
Як тут у сястры, ўжо ў сяле не адна,
Ад'ехала моладзь у гоні далёкія,
Ніхто не выглядвае з хат іх з акна.

НАШ ФАТОГРАФ

Уладзіміру Бугаёву

Ты з бацькам прыехаў калісь з Беларусі
Прывёў ён цябе хутка ў школу да нас,
У хаце тваёй на стале, на абрусе
З падручніка ўрокі я спісваў не раз.
З табой сабраваў я амаль ад пачатку,
Закончылі разам мы сёмы наш клас,
Мы бегалі часам з табой без аглядкі
Па школьнаму пляцу ў свабодны наш час.
Фатографам школьным тады ў нашай школе,
Настаўнікі, вучні назвалі цябе,
Рабіў ты ім здымкі, і ўсё наваколле
Здымаў ты ахвотна на памяць сабе.
Ужо шэсцьдзесят пяць мне гадоў прамінула,
Як здымкі твае праляжалі ў мяне,
Гляджу я на іх з захапленнем прачула,
Я часам іх бачу, як ноччу сплю, ў сне.
На здымках тых бачу сябе ў маладосці,
Як я выглядаў між сяброў маладых,
І хочацца плакаць ад жалю і злосці,
Што ўсе пастарэлі за гэты гады.
Гляджу на сябровак, якіх з таго часу,
Я ўжо не спаткаў больш ніколі ў жывых,
І сняцца яны мне ў сукенках з атласу
Як стройна танцуюць на фоне з травы.
Ці сам перажыў ты пасля час ваенны,
Калі Беларусь патанала ў крыві?
Ці помніш сяброў ты сваіх паіменна,
З якімі на здымках стаіш візаві?

СЛЯДЫ Ў ЖЫЦЦІ

ЧАРНОБЫЛЬ

Аб Чанобыльскім грозным пажары
Я даведаўся ў Індыі ранкам,
Як пад пальмай стаяў на бульвары
Пры аўтобусным брудным паўстанку.
Там на першай старонцы ў газеце
Тоўстым шрыфтам англійскаю мовай
Абвяшчалі аб паніцы ў свеце,
Бо скажоны пыл вее з будовы.
Бо ў Чарнобылі атамны выбух
Рассявае ў Еўропе атруту,
Ён скажае жывёлу і рыбу,
І нясе людзям смерць і пакуту.
Не паверыў тады я адразу
У панічныя весткі з газеты,
Потым доўга чакаў я адказу
На праўдзівасць прарочых прыкметаў.
Яшчэ ў Гомель з людзьмі я паехаў,
І там цэзій мы з ежай прымалі,
Ды ад нашых здароўяў ён рэхам
Дзесь адбіўся, як мячык ад сталі.
Я паверыў пазней, што ў Еўропе
Беларусы найбольш пацярпелі,
Бо скажоныя ветры галопам
Над краінаю іх праляцелі.
І засыпалі ядам смяротным
Іх палі і лясы, і азёры,
І цяпер многа вёсак самотных
Гіне сумна на дзікай прасторы.
Там смуткуюць палеткі, дубровы,
І маўчаць там сялянскія хаты,
Зарастаюць іх дзікія травы,
Акружаюць іх сеткі і краты.

Там у ставах загінулі рыбы,
А ў лясах паўміралі жывёлы,
Там пустуюць людскія сядзібы,
І там дзеці не ходзяць у школы.
Ужо двадцаць гадоў прамінула
Ад страшэннага дня гекатомбы,
І не відна канца, ні адгула
Ад хвароб перажытага тромба.
І трывожна хвалюецца сэрца
Аб маёй беларускай краіне,
Нікуды нам ад болю не дзецца,
Ды чакаць аж скажэнне загіне.

ДЗЕ Ж ЁСЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

У адной краіне смерць касой махае,
І там людзі гінуць пад яе лязом,
А вайны віноўнік ходзіць, як у раю,
Цешыцца, ў палацах п'е віно і ром.
Там на тратуарах кроў людская льецца,
І дзесяткі трупаў там ляжаць наўкол,
А віноўнік смерці бавіцца, смяецца,
І глядзіць на бітвы, быццам на футбол.
Там грахочуць танкі, страшаць верталёты,
Забіваюць з пушак маленькіх дзяцей,
А вайны віноўнік ходзіць без турботы,
І чакае толькі на свой юбілей.
Дзе ж ёсць справядлівасць, як крыкун шалёны
З групаю злачынцаў грымнулі ў набат,
Каб узбагаціць ім зоркамі пагоны
На смерць пасылаюць тысячы салдат?
Дзе ж ёсць справядлівасць, як штодзень там гіне
Ад бомб, куль, асколкаў многа юнакоў?
Дзе ж ёсць справядлівасць, як па ўсей краіне
Ходзіць вораг з пасткай, быццам звераловў?
Ад хвароб ствараюць людзі зёлкі, лекі,
Вынайсці не могуць лекаў ад вайны.
Бог не патрабуе, каб былі калекі,
Каб нам уміралі на вайне сыны.

ПАДАРЫ МНЕ

Памажы мне, мой лёс, каб сустрэў
Я яшчэ многа раз дні вясны,
Каб я цешыўся барвамі дрэў,
Пахам ліпы, чаромхі, сасны.
Падары мне здароўе, мой лёс,
Каб хваробы ўцяклі ад мяне,
Каб я радасць для многіх прынёс,
І не думаў я больш аб вайне.
Падары мне больш сілы, мой лёс,
Каб наперад мог хутка ісці,
Каб зачаты ўжо творчы мой крос
Дясягнуў добрай мэты ў жыцці.
Падары мне больш шчасця, мой лёс,
Каб не меў я ніякіх згрызот,
Каб не мучыў жыццёвы хаос,
Не цярпеў я душэўных маркот.
Не шкадуй мне нічога, мой лёс,
Чаго толькі ў жыцці я хачу,
Я аддзячу табе: мой узнос
У людскую казну я ўплачу.
Я хацеў бы яшчэ, каб са мной
Беларусь больш не знала бяды,
Каб квітнелі, як кветкі вясной,
Яе вёскі, яе гарады.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ СВЯТЫ

Загінулі многія святы,
Якія мы зналі калісь,
Манілі са сцен нас плакаты
Шчаслівым жыццём на зямлі.
На дзень першамайскі хадзілі
Мы з працы ў паход да трыбун,
Амаль кожны з нас нёс паўмілі
Флажок, як чырвоны кавун.
З трыбуны махаў нам рукамі
Партыйны састаў важакоў,
А з рупараў ліўся цуркамі
Гарласты з мелодыяй роў.
Мы гучна калісь святкавалі
У кожным бюро Дзень жанчын,
У гэты дзень кветкі, медалі
Для іх уручаў рой мужчын.
Па працы па ўсіх калідорах
Сталы ўсе ўстаўлялі ў рады,
На іх расстаўлялі бадзёра
Віно і талеркі яды.
Пры іх мы амаль да паўночы
Пілі за здароўе жанчын,
Жадалі ім шчасця ахвоча,
І ў працы вясёлых хвілін.
А ў ліпені дзень адраджэння
Мы ўсе святкавалі штогод,
Ды многія днём зневалення
Лічылі яго між нягод.
Для большасці быў адпачынкам
У лесе ці дзесь над ракой,
Ад працы нялёгкай прыпынкам,
Прыгожаю летняй парой.

Былі яшчэ многія святы,
Якія святкуем цяпер,
Дзень войска змяніў толькі дату
Для новых ваенных кар'ер.
Калішні дзень трэцягага мая,
І дзень незалежнасці зноў
Вярнуліся, быццам бы з раю,
З мінулых далёкіх гадоў.
Яшчэ я іх помню з дзяцінства,
Як бегаў у школу з флажком,
Як нас прапагандай адзінства
Паілі гадамі цурком.
Па святах былых успаміны
Асталіся толькі ў людзей,
Якія прайшлі каляіны
Старых гістарычных падзей.

ПЕРАСЯЛЕННІ

Калісь вясковая варожка
Мне прадказала горкі лёс,
Што буду спаць я ў многіх ложках,
Блукаць па свеце, як матрос.
Перасяляцца буду часта
З чужых дамоў праз многа год,
Начэй не менш, чым паўтараста
Я дзесь прасплю, як пешаход.
Збыліся хутка словы Веры,
І на чужыну я папаў,
Ды па дарозе тры кватэры
Я пад нагайкай прамяняў.
А там папаў я на паддашак,
Дзе праз шчыліны вецер дзьмуў,
І часта ноччу віхар страшыў,
І сыпаў снег мне ўсю зіму.
Пасля акопы і баракі
Мяняў амаль я кожны дзень,
І паліцэйскія сабакі
За мною бегалі, як цень.
Пад Растэмбургам у адрыне
Абселі вошы нас усіх,
А мы галодныя, ў пухліне
Праз доўгі час кармілі іх.
Як фронт прыйшоў, я стаў салдатам,
Штодзень тады мяняў свой дом,
Тры тыдні біўся з супастатам,
Па снегу бегаўшы пяшком.

Паміж развалін у Берліне.
Я дачакаў канца вайны,
І зноў цягнік, і я ў Альштыне
Спаў у казарме ля сцяны.
Далей я ў вёсцы пад Альштынам
Збіраў салдатам ураджай,
Адтуль даехаў я ў гасціну
Па рэйках у бабруйскі гай.
Там я ў бараку спаў дзве ночы
Аж завязлі ў другі барак,
Дзе я, як пісар, мучыў вочы,
Каб напісаць усім нарад.
Там дачакаў я дня свабоды,
Прыйшоў жыццёвы пералом,
Пасля амаль трох год нягодаў
З'явіўся я ў свой родны дом.

НЯШЧАСЦЕ

У студэнцкім інтэрнаце вельмі рана
Рэпрадуктар загудзеў на калідор:
„Абвяшчаем вам няшчасце нечакана,
Правадыр, вялікі Сталін наш памёр!”
І студэнты пазрываліся з пасцелі,
А адзін з іх заругаўся: „ Сатана,
Напужаў нас, быццам чэрці прыляцелі,
Бо я думаў, што няшчасце, то вайна.”
Ён пабег на калідор і рэпрадуктар
Хутка выключыў і ён зусім замоўк,
„Спіце братцы, то была малая лухта,”-
Ён сказаў, замкнуўшы дзверы на замок.
Мы заснулі і не снілася нам нават,
Што ў Маскве вялікі Сталін не жыве,
Нам здавалася, што німб ягонай славы
Згіне хутка, як раса на мураве.

ПРАМІНАННЯ СЛЯДЫ

У той самы час і ў месца мы не вернемся ніколі,
Як другі раз не ўвайсці нам ў гэту самую раку,
І такіх самых не ўбачым мы ўжо вёсак і аколіц,
Знойдзем іншую на лузе і траву, і асаку.
І мы самыя ўжо заўтра будзем іншыя чым сёння,
Кожны час мы ўсе старэем, маладыя, старыкі,
І змяняецца зямля ўся ў дождж і ў ясных сонца
промнях,
Нават многа скал высокіх раскрышыліся ў пяскі.
Аб тым самым часе, месцах нам астануцца ўспаміны,
Фатаграфіі і рэчы, зборы памятак аб іх,
У архівах дакументы і партрэты, і карціны,
Фільмы з хронік і музеі, летапіс падзей быльых.
Каб асталіся сляды пра вас для будучых унукаў,
Запішыце дзеі важныя з пражытага жыцця,
Як вы цешыліся шчасцем, ці цярпелі дзесь у муках,
Дык не станеце бясколернаю плямаю быцця.

НА ПЯЦІДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ШЛЮБУ

Маёй жонцы Ніне прысвячаю

Я помню той дзень, як учора,
Паўвека прайшло, як у сне,
Калі ты калісь ля Сабора
Сама падышла да мяне.
Тады ты мяне запрасіла
У родны, свой скромны ачаг,
Там страсці таемная сіла
Злучыла нас сотнямі цяг.
І з гэтай пары я час вольны
Праводзіў з табою штодзень,
Мы ўсюды хадзілі супольна,
Я быў пры табе, як твой цень.
Чаромха нас моцна звязала
Пачуццём кахання жывым,
Да шлюбу нам шлях паказала
Паміж перашкод бытавых.
У хмурныя дні інтрыганства,
Ты перад яго вастрыём,
Скрывала свой выхад з дваранства,
І ўсё радаслоўе сваё.
Прызнацца баялася ўдала
Ты доўгі час прада мной,
Што дзед твой служыў генералам,
Яшчэ перад першай вайной.
Твой дзядзька ў такіх жа пагонах,
На Крыме з Урангелям быў,
З ім разам тады ў час разгрому
У Сербію суднам адплыў.
Што цёткі твае ўсе ў Белградзе
Жылі ў міжваенныя дні,
Цвілі, быццам яблані ў садзе,
Без клопатаў і мітусні.

Ты толькі цярпела няўдачы:
Бо ўжо ў час дзяцінства, вясной,
У дзень, як у лазні, гарачы,
Ты сталася паўсіратой.
Бо страціла родную матку,
Асталася з бацькам адным.
Ад безлічы розных заняткаў
Ён рэдка быў госцем тваім.
Таксама ён меў герб дваранскі,
Надзелены продкам яго,
Ды жыў між загонаў сялянскіх,
Сям'ю ратаваў ад даўгоў.
Аднак перад самай вайною,
Як радасць у горкай журбе,
Аднойчы зімовай парою
Ён мачыху даў для цябе.
Табе яна маткаю стала,
Праз многа дзесяткаў гадоў,
На захад з табой уцякала,
Аставіўшы родны свой дом.
Тваёю была апякункай
Пасля смерці бацькі твайго,
Дзяцей нашых добрай пястункай,
Кіруючы ў нас ачагом..
І вось я з табою паўвека
Пражыў, як у радужным сне,
Хоць нам не адна небяспека
Гразіла, як смерць на вайне.
Пазнаў я тваіх усіх кроўных,
Старых тваіх цётак жывых,
Дзве з іх у Белградзе чароўным,
А трэцюю блізка Нявы.
Чацвёртую, Коку, ў Бастоне,
Дзе бачны заліў ціхі, Мэн,
А пятую, Аню, ў Альбіёне,
Дзе звоніць на вежы Біг Бэн.

А шостую, Лілю, у Сарнах,
Адкуль ты калісь уцякла,
Дзе побач маёнтак свой марна
„Таварышам” ты аддала.
Пабачылі мы паў-Еўропы,
Былі мы ў Парыжы, ў Альбі,
Праехалі мы праз Радопы
Паблізу арліных арбіт.
Купаліся мы ў Марафоне,
Да Ялты плылі караблём,
Пад храм Пасейдона ў Суньёне
Прайшлі мы ад мора пяшком.
Сабор візантыйскі ў Стамбуле
Прыняў ад нас цёплы паклон.
У Хагене мы аддыхнулі,
Наведалі Дортмунд і Кёльн.
Былі мы ў Адэсе, ў Мамаі,
Знайшлі Залатыя Пяскі,
Дуброўнік гасціў, як у раю,
Даваў нам віно, шашлыкі.
Бад Райхенгаль тыдзень нас бачыў,
Баварыю нам паказаў,
Гасціў летам Заграб гарачы,
І даўгаўпілскі вакзал.
Плылі ў Капенгаген паромам,
Там бачылі Парк Тывалі,
Па Вене блудзілі да стомы,
Хаця там мы ў цэнтры жылі.
Паблізу Сараева ноччу
Цягнік нам спыніў цвёрды сон,
Калі ён раптоўна наскочыў
На нейкі стаячы вагон.
Мы доўга чакалі ў вагоне
Аж новы цягнік нам дадуць,
Бо наш паравоз на адхоне
Ляжаў, пакалечыўшы пуць.

Нас вызвалі ў мытніцу ў Брэсце,
Прасвечвалі там наш багаж,
Пяць раз мы былі ў Будапешце,
А ў Львове, ў Маскве адзін раз..
Зімою канатнай дарогай
Нас днём на Вітошу вязлі,
Пасля ж за гасцінным парогам
Мы „грэну ракію" пілі.
Асталіся толькі ўспаміны
Па тысячах розных прыгод,
Аб нашых прыемных хвілінах,
Пражытых сумесна штогод.
Калі ўжо нам выраслі дзеці,
А ўнукі растуць, як чарот,
Нам лёгка жыць стала на свеце,
Без клопатаў і без турбот,
Таму я хацеў бы з табою
Брылянтавы мець юбілей,
Дажыць у здароўі, спакою
Да праўнукаў нашых дзяцей.

ЭКСКУРСІЯ Ў МІНУЛАЕ

КРАКАЎ – ТРЭЦІМ РЫМАМ

Калісь язычаскі і грозны князь над Віслай
Праследаваў у княстве жорстка хрысціян,
Якія ў веры хрысціянскай непахісна
Трывалі, хоць гразіў ім небяспекаю тыран.
Тады яму святы Мяфодзій выслаў вестку,
Што ён за грэх свой у няволю пападзе,
І край яго ахрысцяць, а ён дзесь на узлеску
Як дзікі куст самотны хутка прападзе.
Аднак вісліцкі князь далей быў пэўны славы,
І не паслухаў ён чужых перасцярог.
Тады князь Святаполк з'явіўся аж з Мараваў,
І князя ў Вісліцы ён лёгка перамог.
Забраў яго ў няволю, вывёз у Маравы
І захапіў яго ўсе землі і людзей,
Епіскапам назначыў ён святога Саву,
Які там цудадзейнічаў, як чарадзей.
Мяфодзій выслаў з ім сваіх місіянераў,
Якія ахрысцілі хутка ўсіх палян,
Загінула зусім язычаская вера,
Усіх язычнікаў змянілі ў хрысціян.
І выраслі цэрквы ў гарадах і сёлах,
Званы ў царкву склікалі прыхаджан,
Вучылі святароў кірыліцай у школах,
Маліліся ў царкве ўсе моваю славян.
Калі напалі раптам венгры на Маравы,
Няслі з сабою смерць, вялікі страх і шок,
Горазд, архіепіскап іх былой дзяржавы,
У Вісліцу з Мараваў назаўсёды ўцёк.
Адсюль ён вызначаў епіскапаў славянскіх
Для сербаў і славакаў, чэхаў і палян
І высылаў місіянераў хрысціянскіх,
Там дзе яшчэ не знялі веры хрысціян.

Епіскапаў ён меў у Кракаве і ў Гнезне,
Яго місіянеры ў Ноўгарад зайшлі,
І чуўся ён, як папа, вольным, незалежным,
Баяліся яго князі і каралі.
Пасля яго наступнік перайшоў у Кракаў,
Тады славянскім трэцім Рымам горад стаў,
І месцам злых інтрыг нямецкіх і атакаў,
Якія тры вякі ён мірна адкідаў.
Аднак нямецкія атакі і крамолы,
Пры дапамозе каралёў, князёў, княгінь,
Змяніць заставілі ўсе цэрквы на касцёлы,
І ў літургіі ўведзена была латынь.
Хоць бунтаваліся паляне, мазаўшане,
Ваяры княжацкія іх перамаглі.
У цэрквы ўставілі пад столямі арганы,
Замест царкоўных песень, музыку далі.
Казалі вымазаць з гісторыі народу
Епіскапаў славянскіх і іх святароў,
Паганскімі назвалі кожную нязгоду,
І ўсе іх бунты супраць швабскіх махляроў.
Мы двух епіскапаў* славянскіх добра знаем,
Бо іх у Кракаве ўпісалі ў каталог,
Царква імёны іх святымі велічае,
Відаць іх вымазаць тады ніхто не мог.

*- Гэта былі самыя першыя епіскапы ў „Каталогу епіскапаў кракаўскіх”, Прохар і Прокул. Мабыць яны былі архіепіскапамі славянскімі. Самымі старымі касцёламі на Вавеле былі:Збавіцеля, Богародзіцы, св. Міхаіла , св. Георгія і св. Марыі Егіпцянкі.. Напэўна калісь яны былі славянскімі цэрквамі . Длугаш у сваёй „Гісторыі” напісаў,што Прохар быў епіскапам 31 год і памер у 986 г., гэта значыць, што ён пачаў быць епіскапам у 955 г. , 11 год раней ад афіцыйнай даты хрышчэння польскага князя Мешка І. (966 г.).

ЗАЗНАЙКА

„Якім ты быў, такім астаўся”,
Не навучыўся ты нічога,
Чужой дзяржаве ты прадаўся,
І не саромішся нікога.
Не памагла ў тваёй хваробе
Паплечнікаў і блізкіх страта,
Якіх ты бачыш у жалобе
У вельмі многіх бедных хатах.
Якія верылі калісьці
Ва ўсе твае ім абацанкі,
Якіх ты для сваёй карысці
Пакінуў ля глухой стаянкі.
На іх плячах дайшоў да славы,
Разбагацеў за грошы здрады,
І акружыўся для забавы
Зграяй клакёраў, прагны ўлады.
Хоць бачыш армію бяздомных,
Дзяцей галодных дома, ў школах,
Ты для кар’еры страціў скромнасць,
Бяды не чуеш больш наўкола.
Пратэсты ўбогіх, іх праклёны
Цябе зусім не бударажаць,
Хоць колькасць іх расце ў мільёны,
Як дзесь у дымаходзе сажа.
А могуць шугануць пажарам,
Які цябе не пашкадуе,
І можаш стаць яго ахвярай,
Хоць ты цяпер таго не чуеш.
Ты ў місію сваю паверыў,
Што сам змяніў сістэму света,
І для цябе адна кар’ера
Найлепшай сталася манетай.

Тваё бязмернае зазнайства
Спаліла розум твой навекі,
Праз дурнату і інтрыганства
Жыццёвай стаўся ты калекай.
Калісь цябе не навучыла
Жыццё ў палацы каралеўскім,
Бо чуўся ты там, як гарыла,
Прыйшоўшы з закавулкаў сельскіх.
І на табе народ пазнаўся,
І больш не дапусціў да ўлады,
Клакёрам толькі ты прыдаўся,
Марыянеткай на парады.
Апомніся пакуль на свеце
Жывуць дзесь аб табе ўспаміны,
Бо можаш быць гісторыі смеццем,
Які ў рацэ, як сцёк загіне.

У РОЗНЫ ЧАС

СТРАХ

Страх усім жывым істотам,
Як вада ёсць неабходны,
Кажа скрыцца ад спякоты,
І пагрэцца ў час халодны.
Страх важнейшы ад адвагі,
Беражэ ён нас ад смерці,
Бо ад голаду і смагі,
Не дазволіць нам памерці.
Змусіць страх набраць нам сілы,
Каб не згінуць з рук варожых,
Страх ратуе ад магілы
Нас заўсёды, калі можа.
Страх заўжды асцерагае
Нас ад ворага, забойцы,
Ноччу зрэнкі расшырае,
Нас змушае быць празорцам.
Не саромцеся прызнацца,
Што баіцеся бандыта,
Бо не сорамна баяцца,
Быць знянацку дзесь забітым.
Кожны з нас вайны баіцца,
Бомб, снарадаў, ран і здзекаў,
А салдату ноччу сніцца
Подзвіг, каб не стаць калекам.
Часам з роспачы і страху
Робяць людзі сабе глупства,
Каб не мучыцца ад жаху,
Жыццё кончаць самагубствам.
І са страху часам людзі
Не лятаюць самалётам,
Ці жывуць дзесь на бязлюддзі,
Бо не страшыць іх самота.

Людзі маюць страх заўсёды
Перад мукамі хваробы,
Перад здзекамі прыроды,
Як б'е гром, трашчаць трушчобы.
Боязь маюць альпіністы,
Што ўзыходзяць на вяршыні,
На шашы матацыклісты,
Лётчыкі на небе сінім.
Чуюць людзі страх на моры,
Як калыша суднам бура,
Ці як на чужой прасторы
Недзе схопіць іх віхура.
Не саромцеся, скажыце:
Сочыць страх заўжды за вамі,
Сцеражэ вас, як вы спіце,
Ці працуеце з сябрамі.

СУБОТНІ ВЕЧАР

Суботні вечар сёння быў спакойны,
Сабакі не брахалі за акном,
Ніхто не ўспамінаў мне тут пра войны,
І спалі ў цёмры дрэвы і мой дом.
Асенні дробны дождж сплываў па шыбах
Як чарвякоў бліскучы ціхі рой,
То пырснуў ён цурком, як ў рэчцы рыба,
То зноў заззяў ён ранняю расой.
І раптам змылася на шыбе рухам мокрым
Усё, што ззяла ярка, як брыльянт,
І пажаўцела ўсё калёрам вохры,
Бо з хмары месяц вылез, як банан.
І за акном зрабілася зноў відна,
І лужыны заззялі на траве
І на душы мне стала так абідна,
Што кветак больш няма на мураве.
Што ўжо зіма ідзе павольным крокам,
Што ўжо на дрэвах згінула лісцё,
Што хутка дзень скрываецца пад змрокам,
Павольна замірае ўсё жыццё.
І я спакойна, ціха без прынукі,
Яшчэ раз праз акно ўзглянуў найперш,
Узяў камп'ютэрную мышку ў руку,
І напісаў пра гэта скромны верш.

КАЛІ ДЗЕСЬ РАПТОЎНА

Калі дзесь раптоўна табе стане зімна,
То ўспомні мінулыя нашы спатканні,
Як мы загаралі на сонечным Крыме,
У Сочы над морам, на дзікіх палянах.
Успомні ты Адлер, Піцунду, Батумі,
Чароўны пляж Гагры, між кветак алеі,
Як катэрам мы даплылі да Сухумі.
Такія ўспаміны цябе разагрэюць.
Калі дзесь раптоўна святло табе згасла,
Пачулася ў цёмры самотная ноччу,
Успомні ты лета ў аўтобусе ў Ясле,
Як сонца свяціла з гары нам у вочы.
Як мы закрывалі два вокны гардзінай,
І жмурылі вочы ад сонца ў адчаі,
А промні праходзілі цэраз шчыліны.
Успомні аб гэтым і ў зрэнках заззяе.
Калі дзесь раптоўна ты згубіш дарогу,
Заблудзішся недзе ў густых каляінах,
Мяне ты заўсёды заві на падмогу,
А я прыбягу да цябе па сцяжынах.
Прыпомні ты роспач сваю ў Ерэване,
Шукаючы ноччу дарогі кірунак,
Як я падышоў да цябе нечакана.
Успомні, чакай, я прыду на ратунак.
Няхай успаміны тваёй асалодай
Акажуцца ўсюды ў жыццёвай дарозе,
Калі ты сустрэнешся дзесь з невыгодай,
Калі жах пачуеш пры самым парозе.

СУМНАЯ ПАРА

Вельмі цяжка стала
Сумная пара,
Сэрца пажадала
Да манастыра.
Там бы памаліўся
За сваю душу,
Крыўды ўсе б забыўся,
Што ў душы нашу.
Песень бы паслухаў
Ціхіх і святых,
Адыйшла бы скруха,
Злосць да ўсіх жывых.
Сумнага надвор'я
Там бы я не чуў,
Неба і сузор'я
Бачыў бы ўваччу.
З ангеламі разам
Быў бы ў вышыні,
Бліскаў бы алмазам
У начным цяні.
Чуўся б там я ў келлі
Вечна маладым,
Там жыў бы ў вяселлі
Доўгія гады.
Я там бы ахвоча
Стаў ля алтара.
Сэрца бегчы хоча
Да манастыра.

ПЯЦЬ ВЯРГІНЬ

Усміхнулася пунсовая вяргіня,
Як прыгожая дзяўчына ў агародзе,
Так пялёсткамі, як губкамі княгіня,
Мне сказала нешта ціха аб пагодзе.
Што яна нядоўгі час ужо жыць будзе,
І хацела б зацвісці ў маім вазоне,
Каб яе дзесь пахвалілі ў доме людзі,
Што яна тут каралевай у кароне.
Распалілася чырвоная вяргіня,
І гарэла ўся ад рэўнасці і злосці,
Бо дзівак якісь назваў яе юргіняй,
Гэта слова давяло яе да млосці.
Бо яна кахання хоча, не насмешкі,
Любіць, каб яе хвалілі і ласкалі,
І не церпіць, што расце паблізу сцежкі,
Па якой тут часта стукаюць сандалі.
Шалясцела побач жоўтая вяргіня,
Быццам шоўкавай сукенкаю на ветры,
Спаглядала, як капрызная дзяўчына,
Янтаром бліскала ў сонцы на паветры.
І хвалілася яна, што залатыя
У яе палёсткі цешацца суседствам,
Што яны і маладыя, і густыя
Захапляць хацелі б свет і чалавецтва.
Умірала ўжо ліловая вяргіня,
Пасінелі, пастарэлі ўсе палёсткі,
Як старэйшая на градках гаспадыня,
Пахвалу пачуць хацела, альбо лёсткі.
Ды другія не сказалі ёй нічога,
Не пацешылі старэйшую вяргіню,
Хоць не лепшая жыццёвая дарога
Іх чакала, бо прыйдзецца ўсім загінуць.

Як заранка, выйшла белая вяргіня,
Як снег яснымі палёсткамі маргала,
Як дух белы, як індуская багіня,
Найвышэйшая над градкамі стаяла.
І глядзела ў неба сіняе бясконца,
Быццам Бога захацела там пабачыць,
А з зеніту любавалася ёй сонца,
І паслала пацалунак ёй гарачы.

ПАКЛІЧ МЯНЕ

Ты пакліч мяне голасам мілым,
Асвятлі мне дарогу вачамі,
Мне дадай цеплым позіркам сілы,
Дакранай мае рукі рукамі.
Аб вясне заспяваю я песню,
Як калісь мы сустрэліся разам.
Хай нам страсці былыя ўваскрэснуць,
Загарацца чароўным экстазам.
Будзем цешыцца кветкамі мая,
Старасць нашу адкінем далёка,
І ў нас радасць жыцця маладая
Паплыве з гэтай песняй высока.
Хай яна даплыве аж да зорак
Прамянямі навокал заззяе,
Хай асветліць адтуль лес і мора,
Светлай радугай з краю да краю.
Я ахутаю ласкай пяшчоты
Твой чароўны ўвесь стан, твар і рукі,
Забяру табе з сэрца маркоты,
І пачуеш прыемных слоў гукі.
Назаву цябе мілай, каханай,
І чароўнай прыгожай жанчынай,
І ад радасці станеш ты п'янай,
Затанцуеш пры мне балярынай.
Гэта будзе ўсё праўдай, не шуткай.
Як не хочаш далей быць самотнай
Так пакліч ты мяне вельмі хутка
Да сябе, а прыйду я ахвотна.

Я НЕ ПРЫЙДУ

Не закрывай дзвярэй ты прада мной,
Я да цябе сілком ніколі не прыйду,
То што было між мною і табой
Даўно прайшло, як снег у каляду.
Чужымі сталі погляды твае,
Якія ты змяніла хутка ў гэты год,
Забыла ты, як мы між каляін
Шукалі ў нашу мэту дружны ўваход.
Ты страціла надзею ў барацьбу
За мову родную сярод сваіх сяброў,
Ты кінула яе, як ссохлую вярбу,
Сказаць саромішся ім пару родных слоў.
Не адкрывай дзвярэй ты для мяне,
Я да цябе на запрашэнне не прыйду,
Не спакушае ўжо мяне твой кабінет,
Бо ў ім нічога для сябе я не знайду.
Як ты саромішся ў царкву пайсці,
Каб там не бачылі цябе твае сябры,
Не маю з чым я да цябе прыйсці,
Не ведаю аб чым з табою гаварыць.
А я раней калісь цябе цаніў,
І верыў, што дарога будзе ў нас адна,
Ды ты зышла з яе сама ў цяні,
І дзеліць нас з табой ужо сцяна.
Яе цяпер не можам мы разбіць,
Каб выбраць мэту новую жыцця,
Каб мы маглі сябе зноў палюбіць,
Дзесь на прыстанку нашага быцця.

ТАК БЫ ХАЦЕЎ Я ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Так бы хацеў я паглядзець,
Што будзе за год дзвесце,
Ці скончаць людзі ўжо старэць
Без боязі аб смерці?
Ці ўжо не будзе бодьш хвароб,
Ні голаду, ні страху?
Не будзе маленькі мікроб
Даводзіць іх да жаху?
Ці будуць чуць сябе ўвесь час,
Як ўсе асілкі ў казках?
Не будуць мучыць іх маразм,
Ні сотні абавязкаў?
Ці войн не будзе больш тады,
Ні кражы, ні нападу?
Мець будуць людзі сапраўды
Бясклсавую ўладу?
Кахацца будуць між сабой?
Не будуць знаць нязгоды?
Мець будуць радасны настрой
Усе наўкол народы?
Не веру, што за дзвесце год
Знаць будуць голад людзі,
Што будуць плакаць ад нягод,
І што вайна дзесь будзе.
Што смерць таксама, як цяпер
Пужаць іх будзе ўсюды,
Што будуць страшыць іх, як звер
Хваробы і прастуды.

ІНТЭРНЭТ

Шэсць гадоў усе сакрэты інтэрнэту
Адкрываліся, як космас, прада мной.
На экране, як на небе дзесь планеты,
Аглядаў іх штораз больш перад сабой.
З кожным нават і далёкім куском света
Мог звязацца я праз некалькі секунд,
Выслаць пошту з дапамогай інтэрнэту,
І адказ атрымаць хутка, быццам цуд.
Высылаў сябрам я музыку і здымкі
У Амерыку, Расію і Берлін,
Атрымоўваў адтуль я зноў навінкі,
Сотні песень, розных тэкстаў і карцін.
Хвалі-кванты аплялі, як павуціна,
Наш нябачны і загадкавы эфір,
Інфармацый ручаі па ўсіх краінах
Інтэрнэт па іх разносіць, як факір.
Інтэрнэт дае бясплатную размову
Мне з сябрамі ва ўсім свеце цераз скайп,
І атрымаць многа фільмаў каляровых
Я магу і ўсе змясціць іх на свой сайт.
Інтэрнэт стаў велічэзнай бібліятэкай,
Там што хочаш можаш хутка сам знайсці,
Без яго цяпер я чуўся б, як калека,
Як сляпы, не ведаў бы куды ісці.
Я знаходжу ў ім і прозвішча знаёмых,
На сваё таксама траплю я не раз,
Па чужых блукаю часта я харомаж,
Па дне мора я хаджу, як вадалаз.
Свае грошы інтэрнэтам высылаю
На рахункі ва ўсе банкі са свайго,
І на пошце ўжо амаль я не бываю,
Не стаю ў чарзе, не маю там даўгоў.
Я вялікім патрыётам інтэрнэту
Стаў, як толькі я пазнаў яго калісь,
Ён яднае ўсіх людзей на цэпым свеце,
Без яго яны ўжо жыць бы не маглі.

АСЕННІ ВЕЦЕР

Асенні вецер дзьме ў галіны,
Лісты зрывае з жоўтых дрэў,
Варушыць гронкамі рабіны,
Мурлыча ім жалобны спеў.
Успамінае час гарачы,
Мядовы пах усіх лугоў,
Вясёлку кветак побач дачы,
Прыемны водар ад садоў.
Як разганяў клубы туманаў
Ён над маленькім ручаём,
Ці дзесь наткнуўся нечакана
На мглой пакрыты вадаём.
Успамінае ён дубровы,
Як там лістоту цалаваў,
І як у лесе выпадкова
Ён дзесь паляну напаткаў.
Як там свістаў ён над вушамі
Ляжачай пары на траве,
І пралятаў паміж кустамі
Па свежай сочнай мураве.
Цяпер так сонца ўжо не грэе,
Няма больш кветак на лугах,
Трава жаўцее і чарнее,
Іржэўнік цёмны на палях.
Дубровы страцілі лістоту,
Галіны голыя ў бяроз
Папалі быццам у дрымоту,
А з неба льюцца хвалі слёз.
І смутна ветру нават стала,
І, як шалёны, ён гучыць,
Таўчэ па дахах, быццам мялам,
І дом ад ветру ўвесь дрыжыць

НАШЫ МРОІ

Ніхто не зняволіць нам мрояў.
Турмы не баяцца яны,
Бо ў думках у нас і ў спакоі,
Гуляюць усюды, як сны.
Адлегласць для іх не існуе,
Не маюць ніякіх граніц,
Ніякага часу не чуюць,
Не страшыць іх гром бліскавіц.
Ніхто іх нідзе не зняволіць,
Ніхто ім не выдасць загад,
Яны не баяцца няволі,
Бо лётаюць смела наўгад.
Дзесь рвуцца яны ўсе ў прастору,
Вышмыгваюць удалячынь,
Узлазяць на скалы, на горы,
Бурляць вадаспадам, як плынь.
Зыходзяць глыбока ў пячоры,
У шахты на самае дно,
Альбо ў батысферах у моры,
Глядзяць на пачвары ў акно.
Ствараюць свой свет дасканалы,
Без хібаў, без малых заган,
І толькі адны ідэалы
Паказвае ім іх экран.
Не важная будзе камічнасць,
Падзей, небывалых інтрыг,
Бо праўда ці рэчаіснасць
Істотнай не стане для іх.

БОЖА, З'ЯВІСЯ

З'явіся нам, Божа нябесны,
І хоць паглядзі тут мінуту,
Які свет зрабіўся злавесны,
Як ўсюды ён сее атруту.
На ўлады Ты нашы кінь позірк,
З нябеснай далёкай ідыліі,
Яны аб Табе, мой Ты Божа,
Зусім і даўно ўжо забылі.
Бо многія з іх бессаромна,
Заняць тут Тваё месца хочуць,
І б'юцца за ўладу нястомна,
Ды часта людской крывёй брочаць.
Ману для людзей абяцаюць,
Як толькі дадуць ім уладу:
Што з імі яны, як у раю,
Жыць будуць без злобы і яду.
Як толькі дарвуцца да мэты,
Чакае людзей паняверка,
Забойцам даюць эпалеты,
Прыхільніка кормяць цукеркай.
А іншых акрадваюць смела
Без боязі і без сумлення,
Абманваюць многіх умела,
Даводзячы іх да знішчэння.
Тваім тут намеснікам з неба
Назваўся не раз узурпатар,
Ад імя Твайго непатрэбна
Кроў льецца і ў будзень і ў свята.
З'явіся хоць раз сюды, Божа,
Спужай іх з-за хмар кананадай,
Тады, хоць на нейкі час можа
Не будзе люд мучыць улада.

МЛЕЧНЫ ШЛЯХ

Мільярды зорак і планет,
Камет і рой свяціл нябесных
Твораць відочны нам сусвет,
А ў ім сузор'е Шлях наш Млечны.
Як галактычны светлы дыск,
Блішчыць ён у пустой прасторы.
Там дзе ўвагнуўся, як меніск,
Знаходзіцца яго апора.
Ён кружыцца наўкол яе,
Як дыск на старым патэфоне,
І ззяе ярка, як калье,
На неба змрочным чорным фоне.
Апору гэту, як кальцо
Знайшлі ў нябачнай дзірцы чорнай,
Сузор'е рдзее дзесь Стральца,
За ёй далёка ў цьме бяздоннай.
Апоры маса – то мільён,
Калі не больш, мас розных сонцаў,
Што ў дзірку быццам бы ў палон
Папалі і сідзяць бясконца.
Не выйдзе з гэтай глыбіні,
Ні гук, ні след малога промня,
Нябачны руль у вышыні
Назвалі людзі дзіркай чорнай.
І ў мёртвых роях зорак Шлях
Стварыў маленькую планету,
Дзе ходзіць звер, лятае птах,
Жывуць мужчыны і кабеты.
Дзе ўсюды бачым мы жыццё,
На дне пячор і ў акіянах,
А летам кветкі і лісцё
Красуюцца на ўсіх палянах.

І дзе з’явіўся чалавек,
Разумная істота свету,
Які ўжо не адзін тут век
Унутр заглядвае сусвету.
І ўжо на Месяц заляцеў,
Прывёз адтуль пясок ён з маху,
Касмічных зондаў дзіўны спеў
Раскінуў ён па Млечным Шляху.

ІДЗІ НАПЕРАД

Ідзі наперад – не спыняйся
У дождж, у буру, ў завіруху,
І дзе б не быў ты, то старайся,
Каб як найменш ляжаць без руху.
Для адпачынку толькі часам
Затрымайся набраць больш сілы,
І зноў наперад самапасам
Ляці арлом падняўшы крылы.
Хай пот з цябе плыве па твары,
Хай дождж табе імжыць у вочы,
Хай бура ў вушы дзме фанфары,
Ты не спыняйся ўдзень і ўночы.
Ідзі да мэт сваіх бясконца,
І ў час халодны і гарачы,
За завярухай будзе сонца,
Пасля дажджу вясёлку ўбачыш.
Ты не змарнуй хвілін пагоды,
Твары дабро ты ўсім, як можаш,
І не ўшчамляй тварцам свабоды,
І ўсюды праслаўляй прыгожасць.
Калі пачуеш нават старасць,
Не паддавайся ты хваробам,
Ты з песняй гучнаю з гітарай
Ідзі наперад па трушчобах,
Тады і смерць цябе забудзе
Пабачыўшы твой тэмперамент,
І можа ты даўжэй жыць будзеш,
І выбяруць цябе ў парламент.

ЛЮДСКІ ЛЁС

Чаго лёс мучыць так адных людзей,
Дае ім і цярпенне і хваробы?
А зноў другім, як добры чарадзей,
Прыносіць лепшыя жыцёвыя аздобы?
Адным дае галечу, голад , боль,
Другім - уладу, славу і багацце,
Ад лёсу нечаканага кароль
Атрымаць можа раны і няшчасце.
Бывае вераломным часта лёс,
Дасць шчодрую спачатку ўзнагароду,
А потым выкіне шчасліўчыка ў адкос
На страшную мітрэнгу і нягоду.
Быў прыкладам такім Напалеон,
Масква якога ўбачыла пагоны,
А лёс яго аддаў пасля ў палон,
На смерць на востраве святой Алёны.
Ссылае лёс спякоту і мароз
На цэлыя плямёны і народы,
І рэлігійны фанатызм, псіхоз,
Які вядзе да войнаў і нязгоды.
Найгорш, як людзям лёс прышле вайну,
Як дзесь прыдуць чужыя салдафоны,
З зялёнай руні зробяць цаліну
Дамы запаляць зарывам чырвоным.
Карае часам лёс правадыроў,
Пачаўшых войны, грозныя напады,
Аднак далей на свеце льецца кроў,
Ваенныя не моўкнуць кананады.

ЗІМОЙ У ХАЦЕ

Белая пярына за маім акном
Цішыня навокал, ні жывой душы,
Серабрыстым снегам замяло мой дом,
Чуюся тут добра ў гэтакай глушы.
Цераз шыбу бачу сіні небасхіл,
Ні адзінай хмаркі не відаць на ім,
Ззяе ў бляску сонца беленькі насціл,
Нават шуму птушак не чую зусім.
Па галіны ў снезе акунуўся сад,
У папахах белых ззяе з дваццаць дрэў
У шарэнгах роўных, як узвод салдат
На паход чакае, чуецца ў іх гнеў.
Злосна спаглядаюць на мой дом і дах
Бо ім дакучае цішыня, мароз,
Вызваліцца хочуць ад сваіх папах,
І чакаюць сумна на свой лепшы лёс.
А мне ў хаце цёпла, напаліў я печ,
Маю тэлевізар, маю інтэрнэт,
Не шуміць за шыбай віхар, як карцеч,
Бачу на экране ледзь не цэлы свет.
Бачу на экране ў Афрыцы вясну,
З Рыо-дэ-Жанейра дзіўны карагод,
Надакучаць „весткі”- ў кнігу загляну,
Прачытаю ціха нейкі эпізод.
Сонца заглянула радасна ў акно,
Асвятліла ярка мой увесь пакой...
Я напоўніў келіх залатым віном,
Выпіў сам з раскошай тут за мой спакой.

ШТО ЧАКАЕ ?

Што нас чакае дзесь па смерці? –
Пытанне людзі задаюць.
Ці ёсць на свеце недзе чэрці?
Ці гэта выдумка і муць?
Ці бессмяротнаю душою
Надораны ёсць чалавек?
Ці цела толькі ў ім жывое,
А як памрэ, то ўжо навек?
Ці мёртвы чалавек ўваскрэсне,
На суд апошні паспяшыць?
Пасля памрэ, як будзе грэшным,
Як праведны - зноў будзе жыць?
Ці пойдзе грэшнік у геену,
Там будзе смажыцца ў агні?
А праведны пасля нязменна
У раю пражыве ўсе дні?
Так верылі калісь яўрэі,
І запісалі ў Запавет,
Пасля зноў новыя ідэі
У хрысціян прыйшлі на свет.
У чалавечым целе раптам
Душу дзесь муселі знайсці,
Якая будзе вінаватай
За ўсе грахі ў яго жыцці.
Яна па смерці чалавека
Жыве, чакае праз вякі
На суд апошні, можа ў здзеках,
А можа ў раю ля ракі.
Ды на Саборы Фларэнційскім
Знайшлі ксяндзы для грэшных душ
Прытулак нейкі званы чысцам,
Дзе мыюць грэх, як чорны туш.

Грахі з нябожчыкаў змываюць
Малітвы ў храме святароў,
І з чыстца душы іх да раю
Дойдуць тады ўжо без грахоў.
І індульгенцыі за грошы
Здымалі з кожнага грахі,
Багаты жыць мог у раскошы
Грашыў і ў рай ішоў сухі.
І мае быць зноў суд апошні,
Іх душы зноў пачнуць судзіць
Ужо з жывымі, і там кожны,
Будзе старацца грэх свой змыць
Ці грэшных пекла зноў чакае,
А праведных чароўны рай?
Ці чысцец згіне, ці бліз раю
Астанецца, як змрочны гай?
А зноў у Азіі народы
Рэінкарнацыю знайшлі,
Там душы ўсе па смерці роды
Дзяцей шукаюць на зямлі.
Каб зноў у іх жывыя целы
Дзесь увайсці і існаваць,
І праз жыцця перыяд цэлы
Іх лёсам новым кіраваць.
Калі раней жылі бязгрэшна,
Не крыўдзілі другіх людзей,
Ва ўзнагароду ўжо бяспечна,
Шчасліва будуць жыць далей.
Калі ж яны раней для здзеку,
Замучылі кагось на смерць,
Цяпер жыць будуць, як калекі,
Хварэць за кару і цярпець.
А джэйны веруюць, што душы
Ёсць і ў жывёл, і ў камароў,
Бо маюць вочы, маюць вушы...
І ў кожным целе маюць кроў.

Бо іх душа па смерці можа
Знайсці ў дзіцяці свой ачаг,
І з мухі станецца вяльможам,
Багатым, як персідскі шах.
Так што чакае нас па смерці
Ніхто не знае сапраўды,
А кожны мусіць з нас памерці
Ці старыком, ці маладым.
І кожны верыць можа ў цуды,
Што ён па смерці ажыве,
І ў небе будзе жыць без жуды,
Як летнім ранкам салавей.

РОЗНІЦА ПАМІЖ ЛЮДЗЬМІ

Адзін ёсць стройны і прыгожы,
Аднак не здольны да нічога,
Другі хоць брыдкі, ды ён можа
Зрабіць для славы велмі многа.
Адзін ёсць вельмі далікатны,
Не скажа пошлых слоў нікому,
Другі яму не адэкватны
Плюе другім у твар свядома.
Адзін чароўны голас мае,
Ды ён спяваць нідзе не хоча,
Другі хрыпіць, аднак спявае
Не толькі ўдзень,таксама ўночы.
Адзін хоць мае тэмперамент
Зусім хлусня яго не цешыць,
Другога выбралі ў парламент,
І там без сораму ён брэша.
Адзін хоць і няўклюдны целам,
У ўсіх жанчын ён поспех мае,
Другі хоць пекны, ды нясмелы,
Жанчын далёка абмінае.
Адзін ёсць вельмі геніяльны,
Таленавітым ёсць прамоўцам,
Другі ёсць з выгляду банальны
А мае ступень навукоўца.
Адзін дзесь вершы піша з мукі,
Ды іх амаль ніхто не знае,
Другі пяра не возьме ў рукі,
І рэдка нешта прачытае.

ЖАЛЕЗНАЯ ЗАСЛОНА

Калісь жалезная заслона
Ахоўвала нас ад людзей,
Якія блізка за кардонам
Жыць мелі ў голадзе, бядзе.
Яна ахоўвала ад ветра
Чужых неведамых ідэй,
Заразнага чумой паветра,
І ад атруты дзікіх змей.
Ад ворагаў нас бараніла,
Што знішчыць хочуць нас у пыл,
Ад крывапіўцаў-здаравілаў,
Якія кроў пілі б нам з жыл..
Ды пах праходзіў праз заслону,
І быў прыемны, як духі,
І праз эфір ляцелі звоны,
Іх чулі нават пастухі.
І людзі раптам сталі верыць,
Што за заслонай дабрабыт,
Што людзі там, як мільянеры,
Жывуць, як маюць розум, спрыт.
Калі ж разбурыла імкліва
Заслону злая грамада,
Яна пабачыла жахліва,
Што за кардонам ёсць бяда.
Што там навокал беспрацоўе,
Ёсць багачы і беднякі,
Што там без грошы і здароўя
Жыць будуць так, як жабракі.

З НОВЫМ ГОДАМ

У Новым годзе вам жадаю,
Таго чаго б хацелі самі,
Жыцця такога як у раю
З сям'ёй сваёй і між сябрамі.
Жадаю вам у Новым годзе
Удачы ў вашых пажаданнях,
У радаснай сямейнай згодзе,
Без горычы і злоўжывання.
У Новым годзе хай навокал
Усе кахаць вас будуць верна.
Каб вас не мучыла ні спёка,
Ні сцюжа з снегам неймаверным.
Хай будуць вам у Новым годзе
На вашы лісты ўсе адказы,
Хай будзе згода у народзе,
Не будзе войнаў ні заразы.
У Новым годзе вам жадаю,
Каб толькі з шчасця чулі слёзы,
Каб вы жылі ўсё лета ў гаю,
Каб там былі сярод цвярозых.
Каб там спявалі птушкі песні,
І мелі чыстае паветра,
І каб заўсёды напрадвесні
Вы чулі музыку маэстра.
Каб смутку вы зусім не зналі,
Ды толькі радасць, асалоду.
На Новы год, каб віншавалі
Заўжды сябры вас з Новым годам.

ВЕРШЫ Ў АЛЬБОМЫ

Я ТАК ХАЧУ ЦЯБЕ РАСПЕСЦІЦЬ

Веры Л.

Я так хачу цябе цяпер распесціць,
Спаткаўшы пацалункам ля дзвярэй.
Як рады я, што ты прыйшла нарэшце,
Што ў зрэнкі загляну тваіх вачэй.
Што распрану цябе ля самага ўвахода,
Павешу ў шафу плашч шаўковы твой,
Што, прывітаюся з табою з асалодай,
І завяду хутчэй у мой пакой.
А там вось на стале стаяць бакалы
Салодкага чырвонага віна,
І піць яго ты будзеш, як на балях,
Хоць будзеш ты са мною тут адна.
І пажадаю я табе тут шчасця,
Ды радасці і роскашы ў жыцці,
Хай загарацца ў сэрцах нашых страсці,
Каб мы маглі вяселле тут знайсці.
Успомнім тут жыццёвыя дарогі,
Якія мы з табою перайшлі,
І нашы перашкоды і парогі,
Адолелі якія мы калісь.
Мы патанцуем разам на паркеце,
Як музыку зайграе патэфон.
І абніму цябе, як у балеце,
Узяўшы гібкі стан твой у палон.
І буду я табе глядзець у вочы,
І слухаць шэпт тваіх прыемных слоў...
Як за акном пабачым цемрань ночы,
То правяду цябе хутчэй дамоў.

Люты 1947 г. ст.Чаромха.

НАША МЭТА

Марыі С.

Тут наша мэта – быць з табою разам,
Куды б не кінуў нас жыццёвы лёс,
І пад кахання радасным экстазам
Пачуццямі ўздымацца да нябёс.
Каханне адкідае ўсе нягоды,
Яго не страшаць гора ні бяда,
Яно цвіце і ў лівень, і ў пагоду,
Так, як вясною яблыні ў садах.
Я цешуся, што я цяпер з табою,
Што я магу тут на цябе глядзець,
І абнімаць цябе сваёй рукою,
Ці нават моўчкі тут з табой сядзець.
Я захапляюся тваёй красою,
Чароўным тварам, позіркам вачэй,
Якія ззяюць скромнасцю святою,
Анёльскай ласкай, зоркамі свячэй.
Я захапляюся тваймі губамі
Без чырвані размазаных памад,
На іх глядзець і днямі, і начамі,
І берагчы, як даражэйшы клад.
І цешуся, што і табе таксама,
Прыемна разам быць заўжды са мной,
І не дасягне нас ніколі драма,
Калі кахацца будзем мы з сабой.
Імкнуся я ўвесь час да гэтай мэты,
Каб толькі ўсюды быць з адной табой,
Каб мы кахаліся з табой зімой і летам,
Каб нашай мэтай сталася **Любоў.**

Верасень 1946 г. Ст. Чаромха

ЗАХАПЛЕННЕ

Любе Ф.

Я захапляюся табою,
Тваёю цуднаю красой:
Як прад іконаю святою
Я чую радасць і спакой.
Гляджу, не маю нават сілы,
Пацалаваць цябе хоць раз,
Твая прываба ўсмешкі мілай
Мяне няволіць, як заказ.
Гатоў я ўпасці на калені
І пакланіцца прад табой,
Маліцца ў ціхім захапленні,
І вызнаць да цябе любоў.
Ды ты ўзяла мяне за руку,
І прыцягнула да сябе.
Твая салодкая прынука
Зышла, як чары ў варажбе.
Прачнуўся я з адзервянення,
Пачуў бадзёрасці прыліў,
І ўжо з твайго благаславення
Цябе да сэрца прытуліў.
Ты прытулілася таксама
З усмешкай мілай да мяне,
І сэрца рытмамі тамтама
Дрыжэла гучна ў цішыні.
Я цалаваў цябе, як п'яны,
Губамі песціў вусны, твар,
І страсці нашага кахання
Гарэлі ў сэрцах, як пажар.

Лістапад 1946 г. Бельск- Падляшскі.

ЯК ЗБЕРАГЧЫ КАХАННЕ

Варвары Д.

Каб пачуццё кахання ў сэрцы зберагчы,
І захаваць яго для нас адных надоўга,
І ўдзень яго нам трэба песціць і ўначы,
І ў спёку летнюю, як і зімою доўгай.
Заўжды нам трэба пазбягаць зласлівых слоў,
Закінуць зайздрасці смяротную атруту,
І ў час збліжэння, хай бурліць у жылах кроў,
І наша дружба, хай адгоніць сплін і смуту.
Няхай нас кіне назаўсёды роспач, плач,
Каб бляскі радасці гарэлі ў нашых зрэнках.
Няхай іграюць аб каханні, як скрыпач,
Нам сцены дома і падлога, і ступенькі.
Няхай усмешкаю заўжды нам ззяе твар,
Грымасы злосці, хай яго не псуюць віду.
Хай скінуць нашы сэрцы свой увесь цяжар,
І хай забудуць недавер'е і абіду.
Хай пацалункі будуць лечыць, як бальзам,
У нас жыццёвыя абразы і нязгоды,
Абдымкі нашы, хай заўсёды стануць нам
Нектарам нашым незабытай асалоды.
Калі ж нас нечакана дзесь раздзеліць лёс,
І доўгі час ты не сустэнешся са мною,
Так як рака пераплывае цераз плёс,
Так мы разлуку перамучымся з табою.
Як сумясціць каханне з буднямі жыцця,
Калі навокал раздражняе нас сучаснасць?
Мы вучымся кахаць у кіпцюрах быцця,
І нашы іспыты пакуль здаём выдатна.

Верасень 1947 г. Бельск – Падпяшскі.

МАЕ ПАДАРКІ

Юліі В.

Я падару табе каханне
Сярод бліскаючай расы,
Пад радугі чароўным ззяннем,
Дзе звоняць птушак галасы.
Я падару табе абдымкі
Маіх гарачых моцных рук,
Пяштоты, танцы, вечарынкі
І пацалункі без прынук.
Я падару табе букеты
Прыгожыш ружаў, васількоў,
І сотні іншых пекных кветак,
І з агародаў, і з лугоў.
Я забяру табе маркоты,
Калі ты будзеш у журбе,
І адганю твае турботы,
Якія мучаюць цябе.
Я падару табе надзею
На долю лепшую ў жыцці,
І веру я ў табе пасею,
Што шчасце можам мы знайсці.
Заўжды чуць буду захапленне
Тваёю дзіўнаю красой.
Чакаць я буду, як збаўлення,
Калі сустрэнешся са мной.
Калі твае пабачу вочы,
Аддам табе ўсяго сябе.
Дык выбірай, што толькі хочаш,
І не адмоўлю я табе.

Чэрвень 1948 г. Бельск – Падляшскі.

ПРЫЗНАННЕ

Соні Г.

Люблю цябе я вельмі, дарагая,
Як у жыцці я не любіў нікога.
І любіш ты мяне, я гэта знаю,
Мы гэта можам прысягнуць прад Богам.
Мы адпусцілі страсці на свабоду,
Упэўненыя ў нашыя вытокі,
Яны даюць нам радасць, асалоду,
Надзею нашай вернасці глыбокай.
Мы цешымся, калі бываем разам,
Нас цешыць наша кожнае спатканне.
І наша радасць ёсць не для паказу,
А з нашага глыбокага жадання..
Пачуццяў нашых мы не замыкаем
У нашых душ глыбокія шчыліны.
Спантанна, быццам кветак пахі ў маю,
Мы чуем іх у кожныя хвіліны.
Мы не саромемся ні ўдзень, ні ўночы
Прызнацца ўсім аб дружбе нашай моцнай
Ты не скрываеш ласк сваіх дзявочых,
І іх паказваеш пры ўсіх навочна.
Я рады, як цябе дзесь спатыкаю,
І, як вітаюся з табою смела,
І ты прыгожая і маладая
Раскошна туліш да мяне ўсё цела.
Люблю тады табе глядзець у вочы,
І бачыць там любоў і хваляванне,
І бачыць, як твой пекны твар дзявочы
Прыемна ззяе ў час таго спаткання.

Ліпень 1948 г. Чаромха.

ПАМІЖ СПАТКАННЕМ

Стэфці К.

Паміж спатканнем нашым, а разлукай
Жыццё цячэ і астаўляе нам
Не толькі радасці, а часта мукі,
І шчасце дзеліць нам напапалам.
Таму разлукі моцна нас бянтэжаць,
І разбураюць нам заўжды спакой,
Аднак даводзяць да жаданняў свежых,
Каб найхутчэй сустрэцца нам з сабой.
Таму, калі спаткаемся мы разам,
І дзесь схаваемся ў наш бастыён,
То цешымся супольнай нашай базай,
Не ўспамінаем больш панурых дзён.
Тады не думаем мы аб расстанні,
Якое можа зноў да нас ідзе,
І пад гіпнозам нашага кахання,
Не заікнемся нават аб бядзе.
Тады мы ў наша шчасце верым цвёрда,
Што ўжо нас не аставіць добры лёс,
Між намі гіне пышлівасць і гордасць,
І занікае ў нас абіды злосць.
Мы цешымся хвілінамі спаткання,
Абдымкамі, пяшчотай нашых рук.
Адгадваем мы нашы ўсе жаданні,
І іх выконваем ахвотна, без прынук.
І дарагі нам кожны пацалунак,
Твой кожны позірк радасць мне дае,
Абдымак твой – чароўны падарунак,
На смутныя ў разлуцы дні мае.

Жнівень 1948 г. Ст. Чаромха

НЕДАТЫКА

Клаўдзіі Т.

Было мне з табою прыемна і міла,
Твае пацалункі я чую ўвесь час,
Ты сілай пяшчоты мяне пакарыла,
І я захапляўся табою не раз.
Сказала ты мне, што мяне не забудзеш,
Бо вельмі бязмерна кахаеш мяне,
І вернай сяброўкай маёй доўга будзеш,
Бо нават са мною цалуешся ў сне.
На нашых сустрэчах і ў будзень і ў свята
Любіла ты быць у абдымках маіх,
Тулілася ты да грудзей мне заўзята,
Здавалася хочаш ты ўціснуцца ў іх.
Змяніла адно жартаўлівае слова:
З абразай пакінула ты наш ачаг.
Цяпер адчуваю я толькі адмову
І сотні калючых, як джала, зняваг.
Хоць слоў прабачэння я выслаў без ліку
З мальбой да цябе, каб не помніла крыўд.
Далей астаешся глухой недатыкай,
Гатовая з дробязі плакаць наўзрыд.
Не хочаш прыйсці прывітацца са мною,
І слоў прабачэння пачуць ад мяне.
Стараешся быць абразлівай і злою,
Халоднаю, быццам бетон у сцяне.
Цяпер лёс кідае мяне дзесь далёка,
І ён нас раскіне на некалькі год.
Чакаю, што зменіць цябе ён глыбока,
І ў лістах прабачыш былы эпізод.

Верасень 1948 г. Чаромха.

Я НЕ ХАЧУ ТАБОЙ ДЗЯЛІЦЦА

Святлане М.

Я не хачу табой дзяліцца
Ні са старым, ні з маладым.
Хай станеш ты маёй крыніцай
Цурка ўспамінаў праз гады.
Хай станеш ты маёй пяшчотай,
Маіх пачуццяў ручаём,
Каб за сабою мы з ахвотай
Заўжды тужылі ноччу, днём.
Хачу, каб толькі ты са мною
Праводзіла ўвесь вольны час,
У парку ціхім, над Нявою
Дзе бляе голасна бакас.
На мосце з коньмі над Фантанкай,
Хадзіць па Летняму Саду,
Зімой катацца дзесь на санках,
Дзе многа снегу і ільду.
Ці ў Пэтэргофе між фантанаў,
Ці ідучы у Эрмітаж,
Ці над Залівам на паляне
Уліўшыся ў марскі пейзаж.
Ці ў інстытуце, ці ў чытальні
Сядзець з табою за сталом,
Ці кнігі выбіраць ў кнігарні,
Ці ўпісваць вершы ў твой альбом.
Найбольш люблю ў тваім пакоі
З табой быць толькі сам – насам.
Вучыцца, цешыцца з табою,
Твой хлебны квас піць, як бальзам.

Май 1949 г. Ленінград.

Я НЕ МАГУ НА ЦЯБЕ НАГЛЯДЗЕЦА

Лене Ч.

Я не магу на цябе наглядзецца.
Я зачараваны дзіўнай красой.
Сэрца, як молат, ад роскашы б'ецца,
Як дзесь сустрэнуся разам з табой.
Твар твой прыгожы, позірк агністы,
І валасы, як жывы аксаміт,
Голас твой звонкі, салодкі і чысты,
Вочы, як летняга неба блакіт.
Стан твой дзявочы гібкі і стройны,
Як у Венеры твой воблік жывы,
Міміка твару з усмешкай спакойнай,
Ззяе, як хвалі пабліскай Нявы.
Я нечакана сустрэўся з табою,
І заўладала маёй ты душой,
І запалаў да цябе я любоўю,
Быццам мы зналіся доўга з сабой.
Там да сябе ты мяне запрасіла
На свой студэнцкі якісь юбілей,
Сотню пяшчот мне тады падарыла,
Зачаравала, як сам чарадзей.
Смутна, калі мы не бачымся доўга,
Сувязь тады нам дае тэлефон.
Цешыць мяне ён, як вязня з астрога
Кожны прагулачны радасны звон.
Я не магу на цябе наглядзецца,
Сам дачакацца цябе не магу.
Бо да цябе, як струмені на рэчцы,
З сэрца пачуцці кахання бягуць.

Верасень 1950 г. Ленінград.

САНЕТЫ Ў АЛЬБОМЫ

КРАСА

Зосі Г.

Мяне заўсёды радуе краса,
Прыгожыя тварэнні цешаць вочы:
І захапляе ранняя раса,
І часта тое, што стварыў нам зодчы.

Найбольш люблю дзявочы пекны твар.
І стройную дзявочую фігуру,
На гладкім целе сонечны загар
І губы без памады і мікстуры.

Таму я зачараваны табой,
Тваёй фігурай і тваёй красой,
Тваёй усмешкай радаснай,чароўнай

Гатовы я ўвесь дзень з табой сядзець,
І безупынна на цябе глядзець,
Як на натуры вобраз непаўторны.

Ліпень 1951 г. Варшава.

ПРЫРОДА

Маі Я.

Прырода творыць, быццам бы мастак
Цудоўныя прыгожыя тварэнні,
І хутка нішчыць, як якісь лайдак,
Усё, што створана для захаплення.

Вясной стварае кветкі і лісцё,
І пахам іх нас радуе навокал.
Зімою забівае ў іх жыццё,
І снегам засыпае іх глыбока.

Ды толькі ты і летам, і зімой
Усіх чаруеш дзіўнаю красой,
І на цябе пакуль яшчэ прырода

Не мае сілы, каб з красой тваёй
Пакончыць так, як з кветкамі зімой.
Хачу, каб пекнай ты была заўсёды.

Лістапад 1951 г. Ленінград

МАЛАДОСЦЬ

Яраславе Х.

Калі па небе сонца рухаецца ўверх,
Дык людзі ўсе глядзяць і цешацца святлам,
Тады на тварах іх мы бачым радасць, смех.
Энергія жыцця дае ім многа сілы.

Калі ж яно хмурнее і спадае ўніз,
Людзі спяшаюцца, каб выканаць занятак,
Знаходзім мы тады адзіны іх дэвіз,
Хутчэй закончыць працу, даць другой пачатак.

Краса твая цяпер, як сонца ззяе бляскам,
І радуйся жыццём, пакуль яна не згасла,
Аднак мне не шкадуй ёй цешыцца супольна.

Пакуль яшчэ мы ў сэрцах чуем маладосць,
Няхай не мучыць нас цень рэўнасці ні злосць.
Каб наша ўсё жыццё прайшло з табой спакойна.

Красавік 1952 г. Ленінград.

ВАРАЖБА

Ядвізе К.

Я сам ніколі не гадаў на картах,
І рэдка хто мне варажыў на іх.
Бо я не веру ў прадказанняў вартасць,
І не звяртаю я на іх свой слых.

Не ведаю, што заўтра ў свеце будзе,
І што мяне спаткае зноў праз год,
Як да мяне звяртацца будуць людзі,
І на які наткнуся эпізод.

Аднак калі ўзгляну ў твае я вочы,
Я бачу іх чароўны дар прарочы
Адгадваць тайныя мае жаданні,

Каб разам быць з табою ў цішіні
Усе свабодныя ад працы дні,
Чакаць на новыя з табой спатканні.

Жнівень 1952 г. Эльблёнг.

ТУГА

Клаўдзіі З.

Не параўнаю я цябе з вясенняй ружай,
Ты прыгажэйшая намнога ад яе,
Яна заўжды завяне, як надыдзе сцюжа,
А ты цвіцеш зімой і ззяеш, як калье.

Усмешка і твой позірк радуюць, як свята,
Бо зіхацяць з іх весялосць і дабрата.
Прыгожага ў жыцці заўсёды малавата,
І не хапае нам ніколі хараства.

Як кожнае дзіця на свежыя ласункі,
Заўжды я на твае чакаю пацалункі,
Бо для мяне яны, як для багоў нектар.

Тужу я за табой пасля ўсіх развітанняў,
І цешуся заўжды я з новага спаткання,
Калі пабачу твой прыгожы мілы твар.

Лістапад 1952 г. Ленінград.

МАЛЬБА

Нане Ю.

Фігуру стройную табе дала прырода,
І спалучыла з дэлікатнай пекнатой.
З усмешкаю тваёй, як з асалодай,
Ды з юмарам, з тваёй сардэчнай дабратой.

Маленькі твар твой шчыры, мілы і прыгожы
Пяшчотны погляд чорных, як вуглі вачэй,
Здаецца, што ахвотна ўсім ён дапаможа,
Як наш прыяцель непадкупны казначэй.

Заўжды, калі я сустракаюся з табою,
Як на ікону спаглядаю я з мальбою,
Каб ты ласкава паглядзела на мяне.

І я з табой тады пачуюся мужчынай,
І буду цешыцца я кожнаю хвілінай,
Як быццам быў бы я ў зачараваным сне.

Сакавік 1953 г. Ленінград.

НЕ ШКАДУЙ

Арыядне З.

Хай цешацца адны з іх тытулаў, багацця,
За іх яны б пайшлі на подласць і разбой,
А я знайду заўжды маю хвіліну шчасця,
Калі я ў цішыні сустрэнуся з табой,

Калі гуляць мы ў парку будзем па сцяжынках,
Ці там на лаўцы разам будзем дзесь сядзець.
І буду чуць тваю любоўнню падтрымку,
Не страшна будзе мне варожасць у людзей.

Так не шкадуй ніколі ласк сваіх дзявочых,
І сустракайся часта ты са мной ахвоча,
І запрашай мяне ў пакой свой ля Фантанкі.

То потым забурліць у нашых сэрцах кроў,
Калі прыпомнім мы сустрэчы нашы зноў,
На нашым новым месцы будучай стаянкі.

Чэрвень 1953 г. Ленінград.

НАДЗЕЯ

Яніне Л.

На лодцы паруснай мы плавалі з табою,
І нехаця ў абдымкі ўпала ты мае,
Калі знянацку хваля пенаю густою
Ударыла па лодцы ў парусоў краі.

Нас хваля ахрысціла зімнаю вадою,
І мы пачулі хутка дружбу да сябе.
І сустракаюся ўжо месяц тут з табою,
Ды на мяне чакае новы карабель.

Расстацца тут з табой змушаюць абавязкі.
Ты будзеш для мяне, як фея з цуднай казкі,
І станеш, як нектар салодкі, ва ўспамінах.

Я веру, што яшчэ сустрэнемся мы разам,
І пісьмы будуць нам прыемнасці наказам,
Надзеяй на спатканне, радасцю адзінай.

Ліпень 1953 г. Страшын ля ракі Радуні.

ЧАКАННЕ

Гені М.

Пазнаў цябе я блізка пры машыне,
Як спісвала ты даныя яе.
І сэрцы нашы ў гэтай жа хвіліне
Пачулі страсць збліжэння да сябе.

Я цэлы месяц цешыўся з табою,
Гуляючы ў далінах дзіўных гор,
І загараючы на пляжы над ракою,
Ці ў рэстаране папіваючы кагор.

А вечарамі мы ў тваім пакоі,
Праводзілі дні ў радасным настроі,
З надзеяю на частыя сустрэчы.

Ты абяцала мне лісты пісаць,
Чароўныя, як ранняя раса,
Чакаючы адказу кожны вечар.

Жнівень 1953 г. Седленцін ля Еленяй Гуры.

УСПАМІНЫ

Дзіяне Л.

Ты, як кветка, цешыш наша вока
Цуднаю, чароўнаю красой.
Позірк твой нас вабіць цёплым зрокам,
Ззяе ў сонцы ранняю расой.

Не забудзь, гадзіннік твой няўмольна
Адбівае час свой і табе,
Не марнуй яго ў жыцці бязвольна,
І ўспаміны захавай сабе.

Хай пражытыя ўдваіх хвіліны,
Стануць нашым доўгім успамінам,
Нашай мілай, радаснай прыгодай.

І як нам маршчыны знішчаць твар,
Старасці пачуем мы цяжар,
То яны нам будуць асалодай.

Чэрвень 1952 г. Ленінград.

РАГНЕДА – ПОЛАЦКАЯ КНЯЖНА

РАГНЕДА Ў НОЎГАРАДЗЕ

Як у летаргіі, быццам нежывую,
Прывязлі варагі ў Ноўгарад Рагнеду.
На кані буланым з залацістай збруяй
Ехаў Уладзімір за павозкай следам.
Па загаду князя заняслі княгіню
У пакой вялікі ў княжацкім палацы,
Палажылі ў ложак мяккі з балдахінам
Ля акон вялікіх пры квадратным пляцы.
Лекарку князь хутка вызваў да дзяўчыны,
Загадаў ёй строга быць заўжды пры хворай
І даваць ёй лекі і сок журавінны,
Каб яе ачуняць, каб забыла гора.
Хворая ляжала тыдзень у гарачцы,
Слова не сказала - енчыла пакрыху,
Часам задрыжэла моцна цела ў спячцы,
Ці зашавяліла вейкамі паціху.
Князь штодзень прыходзіў у пакой да хворай,
Часам заглянуў ён да яе і ўночы,
Лекарку паведаміць прасіў з пакорай,
Як Рагнеда раптам тут адкрые вочы.
Лекарка ёй клала на чало кампрэсы
І змывала з поту твар яе і цела,
Зёлкі ёй рабіла з кветак, з ягад з лесу
І яе паіла імі вельмі ўмела.
А на трэці тыдзень ранкам нечакана
Моргнулі ў княгіні на вачах павекі,
Губы задрыжэлі з енкам загартанным,
З крыкам моцным жаху блізкай небяспекі.
Лекарка падбегла абняла дзяўчыну,
Гладзіла ёй рукі, словы ёй шаптала,
І яна адкрыла вочы на хвіліліну,
І ледзь чутна – „Дзе я?" – ціха запытала.

„Дома, Гарыслава, Вы ў сваім палацы!
Вы ўжо не княжна, а самая княгіня!”.-
Лекарка сказала, сеўшы на матрацы -
Будзеце тут у доме першай гаспадыняй”.
Хворая, аднак, закрыла зноў павекі,
І праз сон паціху нешта мармытала,
Лекарка ізноў дала ёй хутка лекі,
Выпіла княжна іх і праз сон сказала:
‚Дзе мой родны бацька? Што з маёю мамай?
І чаму братоў я тут сваіх не бачу?
Чую, як шалеюць ворагі за брамай...”-
Слёзы паплылі ёй па шчацэ ад плачу.
Лекарка пабегла, вартавым сказала,
Каб паведамілі князя аб княгіні,
Ды, як ён з’явіўся, хворая зноў спала,
Твар яе прыгожы быў, як у багіні.
А на трэці дзень яна адкрыла вочы,
І наўкол глядзела з жахам і здзіўленнем,
Дзесь за балдахінам бачыла, як крочыць
Нейкая жанчына ў вычварным адзенні.
Не магла прыпомніць ложка ні пакою,
Як сюды папала і як захварэла,
І чаму не можа варухнуць рукою,
І чаму баліць ёй, як у ранах, цела.
І тады пачула, як дрыжаць ёй губы,
Бо прыйшлі ўспаміны з Полацка, з асады,
Як людзі ўцякалі ад агню, ад згубы,
Як іх забівалі ворагаў атрады.
Раптам бацьку, матку ўспомніла з братамі,
Як іх паланёных прывялі да князя,
Як братоў пры матцы білі бізунамі,
І як князь стараўся моцна іх абразіць.
І далей бяспамяць... больш ужо нічога -
Дзе бацькі прапалі, ці браты жывыя ...
Помніла, што возам ехала дарогай,
Чула, што балелі рукі,. ногі, шыя.

А цяпер піць хоча, і за балдахінам
Бачыць зноў жанчыну, як ідзе паціху...
Застагнала моцна да яе княгіня:
„Піць хачу – шапнула – дайце піць мне
крыху”.
Лекарка падбегла з лекамі, з пакорай,
Цешылася вельмі, як паіла сокам,
Што пачула просьбу першы раз ад хворай,
Аб тым.што піць хоча, хоць была далёка.
Лекарка сказала, што чацвёрты тыдзень
Тут яна ляжыць без памяці ў тым ложку,
Будзе рады князь, калі сюды ён прыйдзе
І пабачыць сам, што лепш ужо ёй трошкі.
Хворая ўздрыгнула. „Князь? Які?” – спытала.
„То ваш муж, княгіня. Вы ж - ягонай жонкай”.
І Рагнеда боль пачула, як ад джала,
Ад якога раптам застагнала звонка:
- „Я не маю мужа, я яго не знаю.”-
-„А Ўладзімір-князь? Ён ёсць вашым мужам!”-
Аж устаць хацела бедная ў адчаі,
Ёй па цэлым целе праляцела сцюжа.
-„ О, багі мае! За што такая кара?!
Каб прадаць мяне тут ворагу ў няволю,
Лепш далі б атруты поўную мне чару…”-
Плакала яна ад горычы і болю.
Лекарка ёй хусткай выцірала слёзы,
Гаварыла ёй, што князь яе кахае,
Што даўно прайшлі ўсе страхі і пагрозы,
І яе тут шчасце і любоў чакае.
А яе ўзяў князь у Ноўгарад Вялікі,
Каб яна была ў яго тут першай жонкай,
Бо пачаць ён хоча з ёю род шматлікі,
Здольны кіраваць з ім роднаю старонкай.
Словы лекаркі лагодна, як наркотык
Уліваліся княгіні ціха ў вушы,
Ласка рук яе, прыемны мілы дотык
Адагналі з сэрца грозны боль удушша.

І яна зноў хутка моцным сном заснула,
Аб усім забыла на тры дні і ночы,
І рукою рэдка нават варухгула,
Часам, вельмі рэдка прыадкрыла вочы.
Як ачнулася яна чацвёртым ранкам,
То спакойна папрасіла піць жанчыну,
Лекарку тады пазвала ўміг служанка,
З балдахіна ўраз адсунуўшы гардзіну.
Наталіўшы смагу, лекарцы сказала,
Каб яна яе на ложак пасадзіла,
І каб ногі ёй прыкрыла пакрывалам,
Бо пачула ў целе раптам моц і сілу.
І калі сядзела з лекаркаю разам,
Нечакана князь з'явіўся ля княгіні,
Цёпла прывітаў Рагнеду. Без абразы
Лекарцы сказаў, каб выйшла на хвіліну.
У вачах тады Рагнедзе пацямнела,
Не магла сказаць яна тады ні слова,
Князь прысеў пры ёй, і вельмі ўладна-смела,
Руку ўзяў яе, не чуючы адмовы.
І прасіў яе, каб выбачыла здзекі,
Зробленыя ім сям'і ўсёй Рагвалода,
Ён забіў іх з помсты - а яна навекі
Для яго адзінай стане асалодай.
Ён яе кахаў. Не меў ніколі ў сілах
Каб аддаць яе спакойна Яраполку.
Помста шуганула, як агонь, у жылах
За яе знявагу Дабрыні без толку.
Ён шкадуе ўсіх сваіх учынкаў дзікіх,
Толькі словаў ганьбы ён не мог прабачыць,
Як і смерці воінаў сваіх шматлікіх,
Пры асадзе Полацка ў баях гарачых.
Каб бацькі здаліся ў горадзе без бою,
Не чакалі Яраполка на падмогу,
Рагвалод бы жыў там з жонкаю ў спакоі,
Ацалеў бы Полацк, не было б аблогі.

А цяпер ён хоча, каб яна, як жонка,
Кіравала домам і дзяцей радзіла,
Каб дзіцячы шчэбет радасны і звонкі,
Чуць было ў палацы з чарадзейнай сілай.
„У цябе ёсць жонка, ты ж прывёз Алову!?" –
Прашаптала ціха да яго княгіня.
Аж здзівіўся князь, яе пачуўшы словы,
Як папрокі злыя, здраджанай жанчыны.
„Ты мне будзеш першай жонкай і каханкай,
Бо Алова, знаю, не народзіць сына.
Яраполк таксама з жонкай жыў грачанкай."
- Адказаў Рагнедзе князь з капрызнай мінай.
„Слаба мне!"- княгіня мовіла ледзь чутна -
„Я сама падумаць аб усім хацела...".
„Думай, дарагая, не будзь толькі сумнай,
Смутак вельмі шкодны для душы і цела."
Выйшаў князь, княгіня на падушку ўпала,
І закрыўшы вочы ўспомніла пра Полацк,
Як сватоў ад Яраполка сустракала,
Як была пры іх шчаслівай і вясёлай.
Потым Дабрыня з'явіўся нечакана,
Як яна яго абразіла дарэмна,
То была яе найгоршая загана -
Давяла яна да лютасці нікчэмнай.
А цяпер яна - ў руках забойцы бацькі,
Ды гаворыць ёй, што ён яе кахае...
Выхаду няма з князёўскай хітрай пасткі,
Толькі згода з ім - іначай смерць чакае...
Лекарка прынесла харч ёй да абеда,
І княгіня першы раз пачула голад,
Цэраз поўгадзіны ўстала зноў Рагнеда,
На пасцелі села, глянула наўкола.
Папрасіла потым лекарку, каб разам
З ёю перайсці аж да акна ў пакоі...
Лекарка тут споўніла ўсе яе прыказы,
Прытрымаўшы моцна ўсю яе рукою.

Аглядзела пляц вялікі ля палацу
І варагаў муштру, шлемы іх і зброю,
Вочы памутнелі ў беднае ад плачу,
Чуючы іх крыкі прагныя разбою.
На чацвёрты дзень княгіня рана ўстала
І зышла з пасцелі ў радасным настроі,
І прыкрыўшы ложак белым пакрывалам,
Самастойна стала блукаць па пакоі.
Лекарка з служанкай аслупелі з дзіва,
Бачачы княгіні шпацыр па падлозе,
Як яна навокал смела і цярпліва
Ходзіць без аглядкі, быццам па дарозе.
Тут і князь з'явіўся... Голасна смяяўся,
Глянуўшы, як ходзіць стройная княгіня:
„Слаўна Гарыславе! Цуд вялікі стаўся!
Гэта для мяне вялікая навіна!"
Цераз тыдзень князь прадставіў ёй Алову,
Аб'явіў Рагнеду першаю княгіняй.
„Будзеш ёй пакорнай! І вучыся мовы!"-
Князь сказаў Алове, быццам з нейкай кпінай.
Памірылася княгіня з лёсам строгім,
А да Яраполка чула злосць з пагардай,
Што ён не прыйшоў да іх у час аблогі,
Разам з моцным войскам пад яго камандай.
Падбухторвала Ўладзіміра Рагнеда,
Каб на Кіеў у паход хутчэй збіраўся,
Бо не хоча Яраполка мець суседам,
Хоча, каб вялікім князям муж застаўся.
Князь паверыў ёй, што Кіеў возьме цудам,
І ў паход пайшоў у радасным настроі,
З дапамогай ваяводы юды - Блуда*,
Горад Кіеў ён узяў зусім без бою.
Яраполк уцёк у Родню сам са страху
І пакінуў кіяўлян на волю лёсу,
Здраднік Блуду скіраваў яго на плаху
Там яго забілі каты па даносу.

Яраполкаву цяжарную грачанку
Князь прыняў у свой гарэм жаночы чутка,
Даў ёй пекны дом, ля Кіева дзялянку,
Дзе радзіла Святаслава вельмі хутка.
А за ёю ў Ноўгарадзе Гарыслава
З крыкам радасці ўрадзіла мужу сына,
І яго назвала імем Ізяслава,
Каб ён мог уславіць родную краіну.
Як даведаўся Ўладімір, што Рагнеда
Урадзіла ўжо наследніка спагадна,
То ён з Кіева са світай знаным следам
Хутка ў Ноўгарад прымчаўся неадкладна.
Потым даў наказ, каб побач пры сталіцы
Збудавалі вёску для яе пры лесе,
Там Рагнеда з сынам мае пасяліцца,
Будзе слухаць летам салаўіных песень.
А цяпер дзве жонкі забірае ў Кіеў,
Будуць жыць з ім разам у яго палацы,
Хоча цалаваць ім вусны, вочы, шыю,
Хоча быць з княгіняй ноччу пры дзіцяці.

* -Блуду – ваявода кіеўслі пры князю Яраполку, якому князь Яраполк вельмі верыў,аказаўся яго здраднікам. Князь Уладзімір яго падкупіў і ён напалохаў князя Яраполка, што кіеўляне хочуць яго аддаць на смерць князю Ўладзіміру. Князь Яраполк уцёк з Кіева ў горад Родню, які тады стаяў у месцы, дзе рака Рось уваходзіць у Днепр.Кіеўляне ўбачыўшы, што іх князь Яраполк уцёк, падпарадкаваліся без бою князю Ўладзіміру. Калі войскі князя Ўладзіміра акружылі Родню, Блуду ўгаварыў князя Яраполка, што князь Уладімір хоча з ім дагаварыцца. Князь Яраполк ямупаверыў і паехаў у Кіеў і там каты князя Ўладзіміра яго забілі.

Аўтар з жонкай і дачкой у гасцях у сям'і кузіны жонкі аўтара ва Францыі (Латрэк) у 1975 г. Аўтар з кілішкам, а з яго левай стараны яго жонка Ніна. Дачка аўтара Ірына першая злева тварам да бацкі.

Дачка аўтара Ірына і сын Георгій ў Калемігдане
ў Белградзе ў 1970 г.

Змест

УСПАМІНЫ З ПАДЛЯШША
Царскі палац у Белавежы 5
Кляшчэлі ў мінулым 7
У дзяцінстве 10
Лёс маёй маткі 12
Сучасная сялянская моладзь 15
Месяц круглатвары 17
У роднай вёсцы 18
У дзевятнаццаць гадоў 19
Бацькоўская сядзіба 20
Наш фатограф (Уладзіміру Бугаеву) 22

СЛЯДЫ ЖЫЦЦЯ
Чарнобыль 23
Дзе ж ёсць справядлівасць 25
Падары мне 26
Дзяржаўныя святы 27
Перасяленні 29
Няшчасце 31
Прамінання сляды 32
На пяцідзесяцігоддзе шлюбу 33

ЭКСКУРСІЯ Ў МІНУЛАЕ
Кракаў-трэцім Рымам 37
Зазнайка 39

У РОЗНЫ ЧАС

Страх 41
Суботні вечар 43
Калі дзесь раптоўна 44
Сумная пара 45
Пяць вяргінь 46
Пакліч мяне 48
Я не прыйду 49
Так бы хацеў я паглядзець 50
Інтэрнэт 51
Асенні вецер 52
Нашы мроі 53
Божа, з'явіся 54
Млечны шлях 55
Ідзі наперад 57
Людскі лёс 58
Зімой у хаце 59
Што чакае? 60
Розніца паміж людзьмі 63
Жалезная заслона 64
З Новым Годам 65

ВЕРШЫ Ў АЛЬБОМЫ

Я так хачу цябе распесціць 66
Наша мэта 67
Захапленне 68
Як зберагчы каханне 69
Мае падаркі 70
Прызнанне 71
Паміж спатканнем 72
Недатыка 73
Я не хачу табой дзяліцца 74
Я не магу на цябе наглядзецца 75

САНЕТЫ Ў АЛЬБОМЫ

Краса 76
Прырода 77
Маладосць 78
Варажба 79
Туга 80
Мальба 81
Не шкадуй 82
Надзея 83
Чаканне 84
Успаміны 85

РАГНЕДА- ПОЛАЦКАЯ КНЯЖНА

Рагнеда ў Ноўгарадзе 86

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб'яднання
„БЕЛАВЕЖА"

Серыя заснавана ў 1990 г.

Кніжка пяцьдзесят пятая

Рэдактар
Віктар Швед

© Copyright by Dymitr Szatyłowicz 2006

ISBN 83-60534-19-5

Nr 5.

Wydawnictwo PRYMAT. Mariusz Śliwowski
Białystok, ul. Zwycięstwa 26 C lok. 7
tel. 869 14 87, 0602 766 304
WWW.prymat.stnet.pl, e-mail: prymat@stnet.pl